Тыднёвік Магілёўскі



№ 3 (67) 28 студзеня - 3 лютага 2000 г. Кошт 50 руб.

Выдатнейшыя даты для сьвядомых сэрцаў







Гэтымі днямі дэмакратычная і навуковая грамадзкасьць абласнога цэнтра ня можа абмінуць дзьве гістарычныя даты. Каб улада ставілася б да іх таксама паважна, мы б сьвяткавалі ўгодкі гэтых выдатнейшых падзеяў мінулага часу як самыя што ні на ёсьць чырвоныя дні календара. Пакуль жа носім гэтыя падзеі ў сэрцах як заклад веры ў заўтрашнюю волю...

Разьведзеныя па часу на стагодзьдзе, гэтыя падзеі тым ня менш з аднаго шэрагу. Наданьне Магілёву Магдэбурскага права напрыканцы студзеня 1577 года і лютаўскае паўстаньне гараджан супраць расейскіх акупантаў у 1661 годзе яднае спрадвечная народная цяга да незалежнасьці і волі. І Магдэбургскае права і атрыманы за паўстаньне Гэрб (той самы, што мы маем сёньня) сталіся сымбалямі перамогі за жыцьцё, пры якім кожны чалавек і грамадзкая супольнасьць разам вызнаюць патрыятызм, дэмакратыю (уладу народа) і роўную падначаленасьць законам за першасны грунт незалежнай дзяржаўнасьці. І колішняе магдэбургскае самакіраваньне, і заваяваньне волі пазьней былі панішчаныя расейскімі ваярамі.

А памяць, як выглядае, панішчыць нельга. Гэтымі днямі магілёўскія моладзевыя патрыятычныя арганізацыі – не называем іх, бо невядома, якія зь іх «зарэгістраваныя», а якія – не (па новых дэкрэтах узгадка ў друку «незарэгістраваных» можа дрэнна скончыцца для выданьня), – наладзілі шэраг мерапрыемстваў у азначаныя слынныя даты. Сярод іх навуковы дыспут, «рыцарскія» і інтэлектуальныя спаборніцтвы, самаробнае выданьне гістарычна-вітальнага буклету.

(Неназваныя арганізацыі кампэнсуем узгаданьнем прозьвішчаў толькі некаторых прозьвішчаў хлопцаў, якія спрычыніліся да сьвяткаваньня згаданых адметных падзеяў магілёўскай гісторыі: Аляксандар Сіпкоў, Алесь Асіпцоў, Дзяніс Новікаў, Павал Пастухоў, Андрусь Кавалёў).

Уласная інфармацыя

P. S. *Літаральна ў апошнюю гадзіну перад вёрсткай газэты арганізацыйная рада прадстаўнікоў палітычных партыяў паведаміла, што ў нядзелю 30 студзеня а 12-й гадзіне каля ДК ЗШВ адбудзецца дазволены ўладамі пікет, які дэмакраты прысьвяцяць абодвум падзеям патрыятычнага беларускага мінулага.*

Хто чужы на радзіме

Днямі прыйшла вестка аб тым, што група расейскіх пісьменьнікаў зьвярнулася да У. Пуціна з прапановай забясьпечыць прыстойнае пражываньне Васіля Быкава ... ў Расеі. Калегі ўзрушаныя тым, як сустрэла вяртаньне свайго знакамітага на ўвесь сьвет творцы ягоная радзіма: пагардліва, непрыязна, абражальна. Васіль Быкаў, якога справядліва называюць Сумленьнем нацыі, дома – на думку афіцыйнай улады – не патрэбны...

Мы ўпэўненыя, што нават самыя высокія пасады ня ёсьць гарантыяй патрыятызму і любові да радзімы. У беларускім варыянце гэта бачна асабліва яскрава: не Васіль Быкаў чужы на сваёй зямлі. Чужыя тут зусім іншыя людзі.

Вітаючы Васіля Быкава мы падаем сёньня на 6-й старонцы адно зь яго новых апавяданьняў.

У нас ня цяжка быць прадбачлівым

Як мы й меркавалі ў мінулым нумары газэты («Чым скончаюцца візыты»), бягучы тыдзень абласное чынавенства было занятае распрацоўкай «пляну мерапрыемстваў», якія маюць задачай забясьпечыць выкананьне даручэньняў і заўвагаў, што прагучалі падчас «высокага» наведаньня Магілёва. Спраўдзілася й другое прадбачаньне: ніхто ня будзе зьняты з пасады. Нарэшце, угадалі мы і тое, што вуліцы спусьцеюць ад «гандлёвых бабулек»...

Практыка бюракратычнага рэагаваньня на ўказаньні «зьверху» вядомая з камуністычна-савецкіх часоў. І тады, і зараз (а можа зараз найбольш) уся гэтая мітусьня, якой на працягу многіх дзён занятыя дзясяткі адказных асобаў, мае задачу «дэманстрацыі працы», а не яе самую. Ясна, што нарады альбо сэмінары, паседжаньні выканкамаў і штабоў, справаздачы і заслухоўваньні (а менавіта гэтым перапоўненыя пасьлявізытныя пляны), ня здольныя ні ўзмацніць, прыкладам, тэхнічны парк калгаснай вёскі, ні падвысіць якасьць кармоў для «грамадзкага статку». Немагчыма ніякімі мерапрыемствамі прымусіць езьдзіць машыны і трактары бяз паліва, а калгасьнікаў – ударна працаваць без зарплаты (хаця такі эксперымент працягваецца). Самае прадстаўнічае выканкамаўскае паседжаньне не заменіць сабой крэдытаў і інвестыцыяў, якія патрэбныя прамысловасьці, а яшчэ больш – будаўнічай галіне...

Сфэры эканомікі і адпаведна сацыяльнага жыцьця і дабрабыту найменей залежаць ад адміністратыўных захадаў і дысцыплінарных накачак, сьведкамі якіх на мінулым тыдні, дзякуючы тэлевізіі, маглі стаць усе, каго яшчэ не вароцiць ад назіраньня непрыхаванага прыніжэньня ўлады... самой жа сябе. Больш дэлікатны (на выгляд) за свайго начальніка старшыня ўрада Сяргей Лінг, зрэдку нагадваючы пра сябе заклапочанымі пытаньнямі «падсправаздачным» абласным кіраўнікам і сваім жа міністрам, абстаноўкі не ратаваў. Гэтая заля як ніякая іншая ведала: усё вырашае вунь той – адзіны, а таму была апантаная страхам і бязвольнай гатоўнасьцю прыняцьця любога павароту падзей.

Гэтым разам абыйшлося: ён даў кіраўніцтву вобласьці, некатарым міністрам яшчэ колькі часу на выпраўленьне сапраўды бядотнай сытуацыі, забыўшы аднак паведаміць аб тым, за кошт чаго і як гэта можна зрабіць. Ці не адкрытым тэкстам прагучала: а як хочаце, так і рабіце, ня ўздумайце толькі прыдумляць рэформы ці хаця б намацваць тое, што ратуе ўвесь сьвет – рынак. Папярэджаньне падалося залішнім, нашая ўлада – усё! – інтуітыўна альбо сьвядома цалкам справядліва падазрае, што рынак немагчымы без дэмакратыі. Яна ж, дэмакратыя, як вядома, ці ня першая ў сьпісе найбольш небясьпечных ворагаў для той «стабільнасьці і спакою» грамадзтва, якімі беларуская ўлада пахваляецца на ўвесь сьвет.

Знаходзяцца людзі як дома, так і па-за межамі, якія ў гэта вераць...

Уласны камэнтар

КАМЭНТАР ДНЯ

Найлепшы выкрывальнік ілюзіяў – эканамічны погляд

Палітыка – тэма асобная, тут лёгка «патапіць» праблему ў словах. З эканомікай цяжэй. Да яе й зьвернемся. Вось некалькі сыстэмных параметраў і высноў.

Па-першае. Стварэньне адзінае эканамічнае прасторы немагчымае. У Расеі гаспадарка пераважна рынкавая, у нас – камандава-адміністратыўная. Мала таго, расейскі вытворчы капітал – крымінальны. І першае, што ён зробіць – перанясе гэтую хваробу на Беларусь.

Па-другое. Рэжым Лукашэнкі спрабуе схаваць уласныя безгаспадарчасьць і некампэтэнтнасьць, з прычыны якіх асноўны капітал краіны прыведзены амаль да нуля. Патрэбныя мільярдавыя валютныя крэдыты. Па ўсім відаць, Захад іх ня дасьць, а Расея сама стаіць з працягнутай рукою.

Па-трэцяе. Дарэмны спадзеў, што Расея зьнізіць кошты на энэрганосьбіты ды транспартавыя паслугі для Беларусі. Расейскі прыватны сэктар можа гэта зрабіць, калі ўрад кампэнсуе страты, што немагчыма з-за многіх прычынаў.

Па-чацьвертае. Хаўрус прывядзе ў эканоміцы да стварэньня фінансава-прамысловых групаў. На іх грунце Расея, якая валодае большым капіталам, умацуе свае пазыцыі, а Беларусь страціць. Прыкладам гэтага ўжо сёньня можа быць збудаваньне расейскага газавага тэрміналу каля Берасьця. Гаспадар газу – Расея, а калі здарыцца якое няшчасьце, то другі Чарнобыль дастанецца Беларусі.

Па-пятае. Наіўна спадзявацца, што Расея заўсёды будзе рынкам збыту прадукцыі беларускага машынабудаваньня. Там паўстануць уласныя гіганты і ўзьнікне жорсткая канкурэнцыя, што назіраецца ўжо сёньня.

Па-шостае. Хаўрус небясьпечны й для насельніцтва тым, што прывядзе да неадкладнага росту цэнаў. Напрыклад, 1 літар малака каштуе ў Маскве 13 рублёў, ці 350 000 беларускіх рублёў. Хто зь беларусаў можа плаціць такія грошы за харчовыя прадукты?

Нарэшце, **па-сёмае.** Расея завінавацілася ўсяму сьвету 160 мільярдаў даляраў, па 1076 даляраў на чалавека. Калі станецца адзіная дзяржава, то гэтыя непамерныя запазычанасьці будуць плаціць і беларусы.

Вось і ўсе гэтак званыя эканамічныя выйгрышы Беларусі й беларусаў ад хаўрусьнае дамовы з Расеяй.

Ўладзімер КУЛАЖАНКА, прафэсар, Менск


БЕЛАПАН для «ТМ»

Распрацаваны ўладамі праект выбарчага кодэксу не адпавядае абавязацельствам Беларусі перад АБСЭ, – такое заключэньне ўтрымліваецца ў справаздачы, зробленай Офісам па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (Варшава), што ўваходзіць у структуру АБСЭ.

Праект кодэкса, адзначаецца ў дакумэнце, утрымлівае шэраг палажэньняў, якія супярэчаць як самому кодэксу, гэтаксама і Канстытуцыі Беларусі (са зьмяненьнямі і дапаўненьнямі 1996 года). Экспэрты АБСЭ зьвяртаюць увагу на тое, што праект кодэкса не прадугледжвае фармаваньня шматпартыйнага або плюралістычнага складу Цэнтральнай выбарчай камісіі і выбарчых камісіяў іншых узроўняў, не забясьпечвае празрыстасьць іхняй працы і прадастаўляе кіруючай партыі і выканаўчай уладзе «магчымасьць ажыцьцяўленьня аднаасобнага кантролю над усімі выбарчымі камісіямі». Экспэрты АБСЭ ўказваюць на ўвядзеньне празьмерных абмежаваньняў, якія датычныя правядзеньня выбарчых кампаніяў. «Гэтыя абмежаваньні, – гаворыцца ў дакумэнце, – настолькі моцныя, што зводзяць на нішто магчымасьць вядзеньня энэргічнай і яскравай перадвыбарчай агітацыі, і парушаюць права на свабоду слова і самавыяўленьня».

•

Урад Злучаных Штатаў Амэрыкі асудзіў нарастаючыя рэпрэсіі і далейшае пагаршэньне пэрспэктыў вырашэньня канстытуцыйнага і палітычнага крызысу ў Беларусі.



24 студзеня намесьнік прэс-сакратара дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША Джэймс Фоўлі выступіў з заявай ад імя ўрада. У ёй выказваецца падтрымка тым, хто выступае за дэмакратычныя рэформы ў Беларусі. Сярод ахвяр палітычных рэпрэсіяў названыя былі прэм'ер-міністар Міхаіл Чыгір. У заяве падкрэсьліваецца, што ён быў арыштаваны менавіта тады, калі абвесьціў, што будзе кандыдатам на прэзыдэнцкіх выбарах, наладжаных апазыцыяй. Таксама выказваецца меркаваньне, што прысуд быламу міністру сельскай гаспадаркі Васілю Лявонаву засноўваецца на сфабрыкаваных абвінавачваньнях. «Як і ў спадара Чыгіра, адзіная віна спадара Лявонава была ў тым, што ён не пагаджаўся з палітыкай рэжыму Лукашэнкі», – адзначаецца ў заяве. У шэрагу парушэньняў таксама названы працяг суда над дэпутатам Вярхоўнага Савета Андрэем Клімавым, які быў жорстка зьбіты аховай сьледчага ізалятара 13 сьнежня 1999 году, нядаўні прысуд на два гады папраўчых работ па месцы працы ўдзельніку антыўрадавай дэманстрацыі Яўгену Асінскаму і адмова ўладаў расьсьледваць скаргу праваабаронцы Алега Волчака, які быў зьбіты міліцыяй падчас дэманстрацыі 21 ліпеня 1999 года.

«Мы заклікаем рэжым Лукашэнкі спыніць перасьлед палітычных апанэнтаў, – гаворыцца ў заяве. – Такі крок зьяўляецца неабходным, каб працэс дыялёгу пад эгідай АБСЭ меў шанцы на посьпех».

•

Горацкі раённы суд Магілёўскай вобласьці вынес прысуд вядомаму прадпрымальніку, экс-старшыні Мсьціслаўскага райвыканкама Аляксандру Пятроўскаму: «два гады пазбаўленьня волі (умоўна) з абавязковым прыцягненьнем да працы на будоўлях народнай гаспадаркі».

Судовае разьбіральніцтва па абвінавачваньні А. Пятроўскага – частка гэтак званай «мсьціслаўскай справы», якая летась стала ўскоснай прычынай адхіленьня ад пасады старшыні аблвыканкаму Аляксандра Кулічкова. Тады ў Мсьціслаўе было арыштавана некалькі службовых асоб раёна, у тым ліку і старшыня райвыканкама Сяргей Дземідзенка.


Прадпрымальнік А. Пятроўскі абвінавачваўся па шасьці артыкулах Крымінальнага кодэксу Беларусі. Суд прызнаў яго вінаватым у незаконным захоўваньні агнястрэльнай зброі і боепрыпасаў, утойваньні ад падаткаабкладаньня даходаў у буйных памерах і службовым падлогу, які выявіўся ва ўнясеньні ў афіцыйныя дакумэнты загадзя ілжывых зьвестак.

Ступень адказнасьці астатніх удзельнікаў «мсьціслаўскай справы» – былога старшыні райвыканкама Сяргея Дземідзенкі і ягонага першага намесьніка Сяргея Саханкова будзе вызначаць абласны суд.

•

Паводле дадзеных Камітэта дзяржаўнага кантролю вобласьці, сельскія гаспадаркі Магілёўшчыны ня выканалі леташні дзяржаўны заказ продажу прадукцыі.

Заказ «па мясу» калгасы і саўгасы вобласьці выканалі толькі на 90,3 %, малака – на 86 %. Адначасова кантралёры адзначаюць, што гаспадаркі без дазволу мясцовай улады здалі больш за 1500 тон жывёлы на мясакамбінаты іншых вобласьцяў. Каля 2,3 тысячы тон мяса прададзена за межы вобласьці па бартэру, 700 тон – камэрцыйным структурам.



Здаючы неахалоджанае і нізкагатункавае малако, сяляне летась страцілі каля 125 мільярдаў рублёў. Страты ж ад рэалізацыі мяса нізкіх кандыцыяў склалі значна больш – каля 1,5 трыльёна рублёў (неданамінаваных). Увогуле з 373 гаспадарак вобласьці 270 скончылі год са стратамі.

БЕЛАПАН для «ТМ»

Ці апошнім будзе панядзелак

Працэс над экс-прэм'ерам Беларусі Міхалам Чыгіром пасьля кароткага аднаўленьня на мінулым тыдні зноў быў перапынены да 31 студзеня. Судзьдзі задаволілі хадайніцтва абароны даць дадатковы час на азнаямленьне са справаю.

Між тым, нявырашаным засталося пытаньне аб прадастаўленьні для вядзеньня працэсу больш прасторнае судовае залі...

Судовае паседжаньне ў справе Міхала Чыгіра пачалося з учорашніх праблемаў. Ізноў жадаючых трапіць у залю аказалася больш за вольных месцаў. Ізноў гэта было відавочна ўжо за паўгадзіны да пачатку паседжаньня, але адміністрацыя Менскага гарадзкога суду нічога не зрабіла.

Больш за тое, увaход у будынак суду ахоўвалі ўжо ня пяць, а пятнаццаць міліцыянтаў, столькі ж несьлі варту на лесьвіцах і ў калідорах. Нават службовыя пасьведчаньні не дапамаглі шмат каму з журналістаў: за дзесяць хвілінаў да пачатку паседжаньня суд фактычна зачынілі – маўляў, у зале няма месцаў. Некалькі дзясяткаў прыхільнікаў Чыгіра засталіся чакаць вынікаў на марозе, абмяркоўваючы ў тым ліку й тое, колькі каштуе бюджэту такая ахова суда ад грамадзянаў.

Каб вырашыць гэтую нескладаную задачу, я падышоў з дыктафонам да міліцыянта, які камандаваў аховаю будынка. На мой запыт, колькі каштуе іхны працоўны дзень, падпалкоўнік адказаў: «По данному вопросу обратитесь в СЭУ, Бетонный проезд, 3, наше экономическое управление, УВД Мингорисполкома. Вам полные расценки по новому тарифу скажут. Пока ещё на сегодняшний день я нового тарифа и новой зарплаты не знаю». На пытаньне аб колькасьці падпарадкаваных яму міліцыянтаў падпалкоўнік адказаў: «По мере необходимости. Не считал». Далей я запытаўся ў яго, ці не таньней было б арандаваць нейкую вялікую залю, заплаціць за памяшканьне, і на гэтым праблемы скончыліся б. Адказ быў такі: «Согласен с вами». Прадставіўся ж суразмоўца наступным чынам: «Я подполковник милиции УВД горисполкома...», так і не назваўшы свайго прозьвішча.

А тым часам у той жа судовай зале на трэцім паверсе пачалося паседжаньне. Абаронца экс-прэм'ера Юлія Чыгір адразу заявіла пратэст супраць абмежаваньня доступу грамадзянаў на працэс, які быў абвешчаны адкрытым, і запатрабавала забясьпечыць наўпроставую трансьляцыю з залі: «Аляксандар Лукашэнка на працягу года абвінавачваў майго мужа ў тым, што ён абакраў Беларусь. Я хачу, каб той народ, якому ён пра гэта гаварыў, сам быў сьведкам гэтага працэсу. Я думаю, што калі б была прамая трансьляцыя па радыё, то многія з тых, хто сёньня стаіць пад дзьвярыма, сядзелі б дома».

Усьлед за ёй з хадайніцтвамі да суду зьвярнуліся адвакаты Лемеш, Паганяйла й сам падсудны Чыгір. Яны папрасілі суд зьвярнуцца з запытамі па неабходную інфармацыю ў банкаўскія і міліцэйскія ўстановы, а галоўнае, даць дадатковы месяц на азнаямленьне са справаю Барысу Гюнтару, якога суд дапусьціў да удзелу ў працэсе ў якасьці прадстаўніка праваабарончага Цэнтру «Вясна». Гэтае хадайніцтва суд часткова задаволіў, патраціўшы на нарады ледзь не гадзіну. Дзеля дадатковага вывучэньня справы ён адвёў дзесяць дзён.

Міхал Чыгір даў такі камэнтар: «Крымінальная справа мае 18 тамоў. Ёсьць жа выходныя дні, калі суд не працуе. Да 31-га застаецца 5 ці 6 дзён. За 6 дзён пазнаёміцца з крымінальнай справай, якая мае 18 тамоў, а ў кожным томе 300-400 старонак тэксту, я думаю, амаль немагчыма. Я ведаў адразу, што Багданкевіча не дапусьцяць, бо Багданкевіч вельмі добра ведае банкаўскую справу, і ўсё, што напісана ў дакумэнтах сьледчых, магло б быць абвергнута Багданкевічам вельмі рэзка».

Такім чынам, на новае паседжаньне суд зьбярэцца 31 студзеня. Зьбярэцца ў той жа зале, паколькі судзьдзя Васілевіч не пажадаў дамагчыся больш прасторнага памяшканьня.

Алег ГРУЗЬДЗІЛОВІЧ,
Менск


Чалавек ў бядзе

Такую назву носіць адна з грамадзкіх праваабарончых арганізацыяў у Чэхіі. Пра аўтарытэт яе сьведчыць той факт, што летась яна здолела дамагчыся ад свайго міністэрства адукацыі гарантыяў таго, што чэскія вышэйшыя навучальныя ўстановы будуць бясплатна прымаць і вучыць беларускіх студэнтаў, якія выключаныя са сваіх ВНУ па палітычных матывах.

Натальля Маковік, актывістка «Маладога Фронту» і каардынатар гэтай праграмы ў нашай краіне, паведаміла, што як меней 15 менскіх студэнтаў былі выключаныя толькі за «Марш Свабоды», які праходзіў у сталіцы летасьняй восеньню. Нагадаем, што нашая вобласьць таксама ведае палітычныя студэнцкія выключэньні: магілёўцы Ясь Абадоўскі, Андрусь Дзьвігун, горацкія акадэмісты Дзяніс Бобікаў, Анатоль Брыцін сталіся першымі ахвярамі сваёй дэмакратычнай актыўнасьці ў папярэднія гады. Тады яны ня мелі гарантыяў дапамогі й падтрымкі, а тым больш замежнай.

Цалкам верагодна, што зь цягам часу праскія ўнівэрсытэты (як раней – польскія) стануць чэска-беларускімі навучальнымі ўстановамі, за што ім, зразумела, можна толькі ад душы падзячыць.

Рэдакцыйны АГЛЯДАЛЬНІК моладзевых праблемаў





Прынцыпы дзеяньняў засталіся нязьменнымі

Гэта зазначыў, выступаючы ў Магілёве, Аляксандар Лукашэнка пра палітыку, якую праводзіць. А мог бы і не прызнавацца: усё бачна й так.

Скіруем увагу на цэны асноўных харчовых тавараў, што праявіліся ў першыя тыдні года. (Ніякім адкрыцьцём гэта таксама не прагучыць, але некаторая сыстэматызацыя дазволіць падмацаваць фактамі «генэральную лінію» кіраўніцтва). За тры навагодніх тыдні кошт ялавічыны ўзрос на 25 %, сьвініна падаражэла на 16 %, каўбасныя вырабы – на 21 %, а папулярныя ў дзяцей і дарослых сасіскі вырасьлі ў цане ажно на 35 адсоткаў. Мука вышэйшага гатунку, а гаспадыні іншая і непатрэбная, падскочыла ў кошце на 19 %, крупы падняліся на 8 %, а макаронныя вырабы на 7, калі сказаць па-навуковаму, пунктаў.

Цікавая яшчэ тая акалічнасьць, што ўсё гэта здарылася да абвешчанага ўрадам павышэньня закупных цэнаў на прадукцыю сельскай гаспадаркі. Сапраўды, дзяржава забірае зь вёскі прадукцыю амаль бясплатна. Гэта ня толькі не дае ёй разьвівацца, але нават не пакрывае выдаткі, якія пайшлі на выраб гэтай прадукцыі (значная частка ў гэтых выдатках прыпадае на заробкі, таму вёсцы дзяржава вінная шалёныя грошы). Цяпер калгасам за прадукцыю, гэта ўвогуле справядліва, будуць плаціць больш. Розьніцу пакрыюць пакупнікі харчовых тавараў, што ня ёсьць справядлівым, бо вытворчыя галіны эканомікі, а тым больш сацыяльныя сфэры грамадзтва (ахова здароўя, культура, адукацыя і г. д.) пра рынкавыя адносіны ў сваіх галінах нават ня чулі. Відаць, для гэтых людзей міністэрства эканомікі вызначыла пералік тавараў, цэны на якія будуць «рэгулявацца» ад імя дзяржавы, гэта значыць павышацца практычна ня будуць: малако і сьмятана нізкіх працэнтаў тлустасьці, кэфір, цукар, нізкагатункавыя калбасы, садовагародніныя кансэрвы й кансэрвы дзіцячага харчаваньня, соль і запалкі. За цэны на астатнія прадукты харчаваньня «адказвае» нібыта мясцовая ўлада.

...А тым часам з Крамля прыйшло паведамленьне, што «нязьменнасьць дзеяньняў» праявілася ў падпісаньні Граматаў аб утварэньні саюзнай дзяржавы Расея-Беларусь. Ёсьць ужо і старшыня агульнага Савета міністраў. Відаць, цяпер за ўсё будзе несьці «адказнасьць» ён.

Алена БАРЫСАВА,
журналістка.

Разьвіцьцё ... раўназначнае падзеньню



Беларускі Хельсінскі Камітэт завершыў працу над штогадовым дакладам у пытаньні захаваньня правоў чалавека ў Беларусі. «Пачатак III тысячагодзьдзя. Беларусь. Лякальная катастрофа ў галіне захаваньня правоў чалавека» – такую назву мае даклад, дзе аналізуецца сытуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 1999 годзе. Прыводзім зь яго асноўныя вытрымкі з камэнтаром старшыні Беларускага Хэльсінскага Камітэта Тацяны ПРОЦЬКІ.

– У Беларусі ігнаруюцца тры асноўныя прынцыпы разьвіцьця чалавецтва: дэмакратыя, законнасьць, правы чалавека. Мы вызначаем, што сёньня, фактычна, у нас – катастрофа правоў чалавека. Мы вызначаем, што ў нас няма мэханізма абароны гэтых правоў. Суд у нас не зьяўляецца незалежным, бо толькі суд можа ўзнавіць правы чалавека. Мы гаворым пра тое, што ў нас няма дэмакратычна абраных органаў улады, парлямэнт нелігітымны. У нас няма свабоднай інфармацыйнай прасторы.

– Агульная тэндэнцыя 1999-га году – кансэрвацыя катастрафічнага стану з палітычнымі правамі. Колькасьць палітвязьняў павялічылася, што ілюструе адсутнасьць незалежнага суду. Палітычныя апанэнты ўладаў пачалі проста зьнікаць. Забароны на масавыя акцыі насілі татальны характар. Акцыя «па перарэгістрацыі» партыяў, грамадзкіх арганізацыяў і прафсаюзных зьвязаў увяла не рэгістрацыйныя, а дазвальныя прынцыпы існаваньня гэтых арганізацыяў. Усё сьведчыць пра аўтарытарны рэжым з элемэнтамі таталітарных структураў.

– Упершыню ў даклад мы вымушаныя былі ўвесьці разьдзел, прысьвечаны зьнікненьню людзей, што сталася новай нэгатыўнай зьявай у мінулым годзе. Зьнікаюць ня толькі палітычныя апанэнты цяперашніх уладаў, але й простыя грамадзяне. Паводле дадзеных, што фігуруюць у дакладзе, у мінулым годзе засталіся ня знойдзенымі больш за 1,5 тысячы грамадзянаў.

– Яшчэ адной новай часткаю дакладу стаў разьдзел «Пагроза беларускай дзяржаўнасьці», які прысьвечаны дыскрымінацыі беларусаў. Праваабаронцы занепакоеныя тым фактам, што аб'яднаньне Беларусі й Расеі праводзіцца на тле працэсаў у кірунку вынішчэньня нацыянальнае самасьвядомасьці. Такім чынам парушаюцца правы некалькіх мільёнаў беларусаў. Да таго ж працягвалася падзеньне ўзроўню жыцьця, сьмяротнасьць у краіне перавысіла нараджальнасьць. Паводле афіцыйных дадзеных, колькасьць жыхароў Беларусі паменшылася больш чым на 10 тысячаў чалавек.

– У дакладзе адзначаецца, што ў краіне не працуе інстытут прыватнае ўласнасьці, а дэкрэт № 40 («аб канфіскацыі») вынішчыў нават ілюзію магчымасьці йснаваньня гэтага інстытуту.

– Па параметрах дэмакратыі і правоў чалавека Беларусь параўнялася з Афганістанам, Бірмаю, Іракам, Кітаем, Кубаю і Суданам – з краінамі, якія прызнаюцца за горшыя ўзоры цывілізаванага разьвіцьця.

Даклад БКХ будзе накіраваны ў Вену, у штаб-кватэру Міжнароднае Хельсінскае фэдэрацыі, у АБСЭ, Раду Эўропы ды ААН. Афіцыйная прэзэнтацыя дакладу ў Беларусі адбудзецца напачатку лютага.



РАДЫЁ СВАБОДА
BELARUS SERVICE RFE/RL

Слоўнік Свабоды

Сёлета ад пачатку года Беларуская Служба радыё Свабода вядзе рубрыку «Слоўнік Свабоды. XX стагодзьдзе ў беларускай мове. Слова на дзень для памяці і для роздуму». «ТМ» вырашыў скарыстаць гэтыя матэрыялы ў друкаваным выглядзе з тым, каб дапамагчы нашым чытачам атаясамляць сябе й свае мары з нашай агульнай беларускай ПАМЯЦЬЦЮ і ГІСТОРЫЯЙ.

Ь

Гэта ня слова і нават ня гук.

Гэта – знак.

Адно зь ягоных значэньняў – мяккасьць.

Ён забірае на сябе частку мяккага характару беларуса, бо мяккасьць характару сёньня – гэткі самы крымінал для нацыі, як ужываньне мяккага знаку – крымінал для ўладаў.

Цьвёрдага ў сваёй веры ў Бацькаўшчыну беларуса можна пазнаць па колькасьці мяккіх знакаў у тым што ён піша. Чым больш мы перадаем мяккасьці словам, тым цьвярдзейшыя мы самі.

Сьпяваюць «Песьняры» – з гонарам казаў беларус у 70-ых.

«Сьцяна», – цьвёрда напісаў на вокладцы сваёй кнігі Васіль Быкаў.

У сьвеце згінаў не згінайце сьпінаў

Зьмест непазьбежнасьці – у незалежнасьці.

Сяржук СОКОЛАЎ-ВОЮШ

Буракі

У бураках ёсьць цымус: у чырвоных – колер, у цукровых – слодыч. У бураках ёсьць пэрспэктыва – як станеш на пачатку калгаснай баразёнкі, то канец далёка-далёка.

За буракамі – літаратурная традыцыя. «Дудка беларуская» Францішка Багушэвіча выйшла пад псэўданімам Мацей Бурачок.

Бурак – ежа сьціплая і кампанейская: ён ніколі не бывае ў цэнтры стала і сам па сабе: ён ці ў баршчы, ці ў вінэгрэце, ці «пад шубай». Зрэшты, слова гэтае рэдка ўжываецца ў адзіночным ліку – хіба толькі ў вадпаведных прозьвішчах. А так увесь час – буракі і буракі.

У вадрозненьне ад бульбы, буракі асабліва не паддаліся мэханізаванаму вырошчваньню і таму ўвасобілі ў сабе ўвесь цяжар калгаснага прыгону. Калгасныя буракі дзялілі на дзялкі – на пачатку заўсёды доўгіх баразнаў брыгадзір убіваў калкі з прозьвішчамі калгасьнікаў, не выключаючы і пэнсіянэраў. Тыя мусілі адбыць дзьве праполкі, а часта – калі калгас ня меў іншай сілы – дагледзець да канца – выкапаць, пачысьціць і пагрузіць на трактары. Не пайсьці на буракі – было роўназначна бунту, ці адкрытай апазыцыі. Не апалоўшы буракі нельга было атрымаць сена, каня ці талонаў на цукар.

Таму на буракі хадзілі да сьмерці. Чым больш старэла вёска – тым ніжэй згіналіся постаці на бураковых палетках – пакуль урэшце самыя нямоглыя не станавіліся ў баразёнках на калені.

Бурак – адно са словаў, якому ўдаецца амаль цалкам выцесьніць зь беларускага лексічнага поля свой іншамоўны адпаведнік. Нават на трасянцы мала хто кажа «свекла». А тыя, хто імкнецца перамагчы свой акцэнт, вынайшлі кампраміс: „буряк».

Алена ЦІХАНОВІЧ

Дуда

Эх, скручу я дудку,
Такое зайграю,
Што ўсім стане жудка
Ад краю да краю.

І стала жудка, і вершы Францішка Багушэвіча як праклятым залом застаўся на беларускай ніве ў XX стагодзьдзі. Яго спрабаваў разблытаць Купала, ды і ягоная дудка-жалейка дачасна зайшлася жалем. І коласаў Сымон-музыка ня даў рады, хоць і сілкаваў свой талент ад «песень-вечароў, ад казак-дудароў». А казка Дудара на імя Алесь у 30-я гады пачыналася зусім не на казачны лад: «Пасеклі наш край напалам».

Вясёлыя сынонімы дудкі – сьверасьцёлка, сапёлка, шасьцяруха, пішчэлка, гульлівыя прыказкі накшталт «Без смыка і без дуды ходзяць ногі не туды» ня здолелі адвадзіць містычнай багушэвіцкай жуды ад тых, хто адважваўся дудзець. І невядома, куды зайшлі ногі Ўладзімера Дудзіцкага, які бясьсьледна зьнік ў 70-я гады ў накрайсьветнай Вэнэсуэле, даўшы згоду ачоліць Беларускую службу Радыё Свабода.

Дуда за 400 гадоў свайго існаваньня на Беларусі была і сакральным інструмэнтам, бо аджывлялася духам. На здольнага паэта ці песьняра казалі «Божая дудка».

А калі на беларускім апазыцыйным мітынгу ў 90-я гады ўшаноўвалі хвілінай маўчаньня памяць Джахара Дудаева, чачэнскі герой не здаваўся чужаком, бо ягонае прозьвішча лёгла дзялілася на два беларускія словы.

А ў сучасных змагарных песьнях дуда навт захапіла першынство сярод вайсковых музычных інструмэнтаў:

Дуды над хлопцамі граюць трывожна,
Над полем бітвы сьпявае рог,
Тапчыце зямлю, легіёны Божыя,
Наперадзе вораг, за намі – Бог.

Гэта – гімн беларускага «Белага Легіёну», чые ўлёткі прамаўляюць да людзей коратка як стрэл – мы тут.

Міхась СКОБЛА

Выпадак у краме

Гэта здарылася са мной 30-га сьнежня. У гэты дзень мы чакалі гасьцей з Адэсы. Раніцай жонка спахапілася, што зь вечара не набылі хлеба. Я пабег у «свой» гастраном «Космас». Стаў у чаргу чалавек не трыццаць, бо прадавачка прымала сьвежы хлеб. Рабіць людзям не было чаго, паступова пачалася гаворка пра жыцьцё-быцьцё. Пачуліся скаргі на нізкія заробкі, высокія цэны, наогул на сытуацыю ў краіне. Усе гэтыя развагі я чуў ці не сотню разоў: прэзыдэнт стараецца, але што зробіш – усім зараз цяжка. Ведаю, што тых, хто так думае, нічым не праймеш. Але не вытрымаў, уступіў у гаворку, ды, відаць, на чыюсьці думку занадта актыўна. Не прайшло і трох хвілінаў, як у краму зайшлі трое ўзброеных аўтаматамі міліцыянтаў – і адразу да мяне. Прывялі ў кабінэт загадчыцы магазіна, дзе пачалі складаць пратакол аб тым, нібыта я скраў нейкі стакан. Пад гэтым пратаколам падпісаліся – як сьведкі! – загадчыца магазіна, якая, праўда, не падняла на мяне вачэй, і яшчэ нейкая прадавачка. У іх міліцыянты, дарэчы, не распытвалі пра дэталі «справы», а проста падсунулі паперу: падпішыце. Мяне таксама не распытвалі і нават не абшукалі, а павезьлі ў пастарунак, правёўшы перад гэтым праз магазін пад аўтаматамі. У апорным пункце міліцыі мяне штурхнулі ў «тэлевізар», гучна аб'явіўшы папярэднім затрыманцам: мужыкі, а мы вам бэнзэфаўца прывезьлі! Як гаворыцца, усё стала на свае месцы. Праз колькі часу мяне выклікалі да афіцэра, які запытаўся ў мяне, чаму я не падпісаў пратакол. Я патлумачыў усё, што са мной адбылося. Мяне выставілі за дзьверы, а да афіцэра выклікалі тых самых міліцыянтаў. Яшчэ праз гадзіну мяне адпусьцілі без прабачэньняў і тлумачэньняў. Заходзіць у тую ж краму за хлебам мне расхацелася. Няёмка было не за сябе, бо я нічога дрэннага, а тым больш злачыннага не рабіў (нібыта скрадзены стакан – чыясьці пасьпешлівая выдумка, каб мяне затрымаць). Няёмка і горка было за абедзьвюх жанчынаў, якія ня толькі бессаромна падпісалі хлусьню, а, магчыма, і выклікалі міліцыю. Цікава, ці аддзячылі іх «за пільнасьць»? Шкада, калі яны ня ведаюць з гісторыі, што такія рэжымы, які ўсталёўвае ў краіне іхны любімы прэзыдэнт, дзякуюць толькі тым, што кідаюць за краты спачатку тых, на каго данесьлі, а потым тых, хто данёс...

Валеры РАЗУМАЎ, мастак

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА



Чыноўная мара пра бязьлюдныя вуліцы

Намесьнік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Яўген Мельнікаў днямі адмовіў групе гараджанаў ***у іх праве*** правесьці шэсьце з плякатамі на, так бы мовіць, актуальную тэму барацьбы з бюракратызмам. Улада зачынілася ад людзей самым непасрэдным чынам. Нібы на парозе сакрэтнага аб'екту, вы сутыкнецеся ў Доме саветаў зь міліцыянтам пры мэталёвай загародцы. Ён ня толькі "с пристрастием" распытае вас куды, да каго і навошта вы ідзеце, але запатрабуе дакумэнт і запіша дадзеныя зь яго ў нейкі сшытак. Пры гэтым "на адказным пасту" за суткі дзяжурыць ці ня ўзвод міліцыянтаў, утрыманьне якіх забясьпечваецца, зразумела, зь бюджэту, гэта значыць – за кошт усё тых жа небаракаў-наведвальнікаў. Людзі, якія замаўлялі шэсьце, мелі намер прыцягнуць увагу гараджанаў і ўлады да шмат якіх яшчэ заганаў магілёўскага бюракратычнага апарату, які не забясьпечвае, на іх погляд, вырашэньне многіх праблемаў гарадзкога жыцьця.

Улада, як адзначана, не дазволіла гэта зрабіць. Падставай для адмовы стаўся менавіта – увага! – клопат пра гараджан. Намесьнік старшыні гарвыканкаму, які падпісаў "забаронную" паперу, на афіцыйным бланку зазначае (падаем на мове арыгіналу): "при движении 160 человек по тротуарам улиц города будут создаваться аварийные ситуации". Як быццам штодня ***тысячы*** людзей абсалютна вольна ня ходзяць па гэтых самых вуліцах! А можа гэтак да часу, можа ў афіцыйнай паперы міжволі прагучала прыхаваная мара высокапастаўленага чыноўніка: каб ніхто без дазволу не хадзіў ні па якіх вуліцах тратуарах.

Віктар АБРАМОВІЧ, вольны прадпрымальнік

Праграма тэлебачаньня з 31 студзеня па 6 лютага

•• Понедельник, 31 января ••

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізычна (па часе) не пасьпявае яе перакласьці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 "Сегодня с вами..."
9.50 Здоровье.
10.15 Детский экран. "Я рисую".
10.30 Мультфильмы.
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 "Фантазии на темы Фаберже". Киноочерк.
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.15 "Голубые горы, или Неправдоподобная история". Худ.фильм.
14.45 Мультфильм.
15.12 "Все любят цирк".
15.45 Видеокурс немецкого языка.
16.15 ТВ — школе.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..."
17.40 Документальный экран. "Солнышко в глазах".
18.00 "Земля моя добрая". Телеочерк.
18.25 "Понедельник с "Христофором".
18.40 Спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.30 Видеозарисовка.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Л.Гурченко и С.Любшин в мелодраме "Пять вечеров".
23.40 Криминальная хроника.
23.45 Третий тайм.

ОРТ

13.30 Программа "Вместе".
14.00, 17.00, 23.20 Новости.
14.20 "Охотники за привидениями".
14.40 Что да как.
15.00 Звездный час.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 "С легким паром!"
17.55 Мы и время.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 "Секретные материалы".
22.40 Взгляд.
23.35 "Майк Хаммер: Роковая встреча".

"РОССИЯ"

15.30 "Секретные агенты".
16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Сиреневый туман.
20.40 Дженни Робертсон в мелодраме "Не могу сказать "люблю".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Она написала убийство".
8.50 Мультфильм "Хитрая ворона".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Вчера в "Итогах".
10.45 Куклы.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Среда обитания".
13.30 "Чистосердечное признание".
13.55 "Улицы разбитых фонарей - II". "Аварийная защита".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 "Скорая помощь".
19.55 Совершенно секретно.
21.45 Двое.
22.30 "Итого".
22.55 Сегоднячко.
23.35 Сегодня в полночь.
23.55 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя". Телесериал. 1-я серия.
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Российские меценаты". Бахрушины.
12.05, 13.45 Опера Г.Доницетти "Мария Стюарт".
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк". Телесериал.
15.35 Времена и воины. "Воины фараона".
16.00 Осенние портреты. Элина Быстрицкая.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.15 Пунктир.
13.45 Телелоцман.
14.05 "Скарбы". "Связь поколений".
14.25 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 Астро-дайджест.
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.45 "Фанатики колес". Док.сериал.
9.10 "Тамми". Приключения.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "Сверхестественное". Док.сериал.
18.00 "Праздник в Вашем доме".
18.50 Мультфильм.
19.00 Тяжелый день.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Инженер Графтио". Худ.фильм.
22.05 Астро-дайджест.
22.15 "Государственная тайна". Детектив.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.06—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.40 "Пляж".
19.23, 20.58 Прогноз погоды.
19.25 "Поздравления".
21.00 "В гостях у бабки Агапки".
21.15 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.40 "Дикие сердца". Худ. фильм.
23.25 Спортивная программа.

•• Вторник, 1 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.10 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.30 "На волне взаимопонимания".
10.15 Мультфильм.
10.30 "Сегодня с вами..."
11.10 "Кофе с ароматом женщины".
11.50 Третий тайм.
12.20 Мультфильм.
13.10 Земляки.
14.10 Туробъектив.
14.30 Бездельник.
15.10 Видеокурс итальянского языка.
15.35 Видеокурс английского языка.
16.00 ТВ — школе.
16.30 "Красноречивый цвет". Телеочерк.
17.15 "А музыка звучит..."
17.35 Гости в дом.
18.00 Документальный экран. "Путь-дороженька не торная".
18.40 Спортивные новости.
19.15 "Диалоги веков". Белорусская драматургия сегодня и завтра.
19.55 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм "Рейнджер из атомной зоны".
23.35 Криминальная хроника.
23.40 Музыкальный салон. "Покидая навсегда..." Часть 2-я.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 "С легким паром!"
9.45 Как это было. Афера века. Дело "Властелины". 1995 год.
10.20 Мультсеанс: "Старик и петух".
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.40 Возможно все!
15.00 Программа "Царь горы".
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Смехопанорама Евгения Петросяна.
17.55 Ищу тебя.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Н. Рыбников и И. Макарова в кинокартине "Высота".
22.40 А.Гордон. "Собрание заблуждений".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Лето нашей тайны".
10.55 Мультфильмы.
15.30 "Секретные агенты".
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Полный модерн.
20.45 М. Могилевская, Н. Еременко, С. Газаров и Б. Невзоров в боевике "Гладиатор по найму".
22.30 Телеспецназ: "Дежурная часть".
22.45 Программа "Уловка-22".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 Совершенно секретно.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 "Третий тайм".
10.15 Путешествие натуралиста.
10.45 Фитиль.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Среда обитания". Заключительная часть.
13.30 Е. Леонов, О. Янковский, Л. Лужина и А. Джигарханян в фильме "Гонщики".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.05 "Скорая помощь".
19.55, 21.45 "Глас народа" представляет: "Царь Борис".
22.40 "Глас народа". Программа Евгения Киселева.
23.45 Сегодня в полночь.
0.05 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя". Телесериал.
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Большая любовь Бальзака". Худ. фильм.
12.35 ...Запутанный сюжет.
12.45 "Время назад". (Памяти В.Мейерхольда).
13.45 Мультфильмы.
14.30 Рассказы старого сплетника. "Театр в Камергерском".
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Ассирийцы".
16.10 Ортодокс.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.30 Тяжелый день.
14.50 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.50 "Фанатики колес". Док.сериал.
9.15 "Инженер Графтио". Худ.фильм.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "За пределами науки". Док.сериал.
17.55 "Праздник в Вашем доме".
18.30 Катастрофы.
19.00 Бобруйский вариант.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Табачный капитан". Комедия.
22.05 Астро-дайджест.
22.15 "Коля". Мелодрама.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.10—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Мультфильм.
18.40 "Пляж".
19.23, 20.58 Прогноз погоды.
19.25 "Поздравления".
21.00 Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.35 Боевик "Драка в Бэттл-Крик".
23.05 Спортивная программа.

•• Среда, 2 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20 Новости.
8.00 Документальный экран. "Театральный роман".
8.30 Мультфильм.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс итальянского языка.
10.05 "Волшебник Изумрудного города". Спектакль. Часть 1-я.
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 "Жостовская роспись". Киноочерк.
12.05 Компьютерный полигон.
12.25 Зорная ростань.
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием чемпионов высшей лиги КВН — команды КВН БГУ.
15.10 "Все любят цирк".
15.45 Видеокурс немецкого языка.
16.15 "5 x 5".
16.45 Мультфильм.
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 Судьба моя и надежда.
18.00 Документальный экран. "Мой Минск. Ностальгическое путешествие".
18.40 Спортивные новости.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.40 Лотерея "Толока".
19.55 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Ж.-К.Брисвиль. "Ужин". Телеспектакль Национального академического драматического театра им.М.Горького.
23.45 Криминальная хроника.
23.50 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.25 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Джентльмен-шоу.
9.45 Ищу тебя.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.40 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Маски-шоу.
17.55 Человек и закон.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Комедия "День сурка".
22.50 Программа "Цивилизация".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Лето нашей тайны".
10.55 Мультфильмы.
15.30 "Секретные агенты".
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Сам себе режиссер.
20.45 Джекки Чан в боевике "Проект "А".
22.40 Телеспецназ: "Дежурная часть".
22.55 Программа "А".
0.20 Горячая десятка.
1.15 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Царь Борис". 1-я серия.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.30 "Царь Борис". 2-я серия.
10.30 Фитиль.
10.40 "Среда".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Короли и капуста".
13.30 Л. Ульфсак, А. Яковлева, В. Бычков и Л. Гузеева в остросюжетном фильме "Белое проклятье".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 "Скорая помощь".
19.50 Боевик "Агент национальной безопасности". "Легион".
21.45 Независимое расследование.
22.35 Сегоднячко.
23.25 Сегодня в полночь.
23.45 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя". Телесериал.
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Большая любовь Бальзака". 7-я серия, заключительная.
12.35 Поклонникам Терпсихоры.
12.50 Дом актера. Людмила Целиковская.
13.45 "Ну, погоди!" Мультфильмы.
14.30 15-й подъезд.
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Македонцы".
16.05 В.Родзянко. "Прощание с Родиной". Фильм 1-й.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.25 Бобруйский вариант.
14.45 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.55 "Линия полета". Док.сериал.
9.20 "Табачный капитан". Комедия.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильмы.
17.50 "Мир скорости". Тележурнал.
18.20 "Праздник в Вашем доме".
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Белый груз". Боевик.
22.20 Астро-дайджест.
22.30 Спорт планеты.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.10—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.40 "Пляж".
19.23, 20.58 Прогноз погоды.
19.25 "Поздравления".
21.00 "В гостях у бабки Агапки".
21.15 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.40 "Пешка". Худ. фильм.
23.10 Спортивная программа.

•• Четверг, 3 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.10 Королевская охота.
9.40 Мультфильмы.
10.05 "Волшебник Изумрудного города". Спектакль. Часть 2-я.
11.10 "Кофе с ароматом женщины".
11.50 Мультфильм.
12.05 Наш край. Из истории г.п.Лельчицы Гомельской области.
12.25 "Родное слово".
13.15 "Человек из черной "Волги". Худ.фильм.
15.10 Видеокурс итальянского языка.
15.35 Видеокурс английского языка.
16.00 ТВ — школе.
16.30 Гости в дом.
17.10 "Романсы". Фильм-концерт.
17.30 "Константин Заслонов". Телеочерк к 90-летию со дня рождения.
17.55 Р.Янковский в короткометражном худ.фильме "Попугай".
18.40 Спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.30 Видеозарисовка.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.55 Крок-2. Молодежная музыка: миф или реальность? Прямая линия.
22.40 Д.Харатьян в авантюрной комедии "Частный детектив, или Операция "Кооперация".
0.15 Криминальная хроника.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Маски-шоу.
9.45 Человек и закон.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 Мультсериал "Охотники за привидениями".
14.40 Семь бед — один ответ.
15.00 Программа "100%".
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 "Каламбур".
17.55 Процесс.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Валерий Приемыхов и Татьяна Догилева в фильме "Кто, если не мы".
22.40 Фотоателье "Тихого дома".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Лето нашей тайны".
10.55 "Лечение Василия". Мультфильм.
15.30 "Секретные агенты".
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Клуб "Белый попугай".
20.45 Боевик "Проект "А"-II".
22.35 Телеспецназ: "Дежурная часть".
22.50 "Кино+ТВ". Тележурнал.
0.20 Баскетбол. Евролига. ЦСКА — "Тофаж" (Турция). Передача из УСК ЦСКА.
1.40 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Агент национальной безопасности". "Легион".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Независимое расследование.
10.15 Большие родители.
10.45 Мультфильм "Кот в сапогах".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Короли и капуста".
13.30 Г. Полосков, А. Яковлев и В. Дворжецкий в остросюжетном фильме "Акваланты".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.05 Телеигра "О, счастливчик!".
19.50 "Агент национальной безопасности". "Доктор Фауст".
21.45 "Женский взгляд".
22.20 Сегоднячко.
23.10 Сегодня в полночь.
23.30 Дэниэл Стерн в фильме "Выстрел".

"КУЛЬТУРА"

(Профилактика).

"МОГИЛЕВ-1"

17.00 Ток-шоу "Я сама". "Как помочь горю".
17.55 "Праздник в Вашем доме".
18.50 Мультфильм.
19.00 "Откровенно..."
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Золотая молодежь". Комедия.
22.20 Астро-дайджест.
22.30 "Дом там,где сердце". Мелодрама.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.10—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 "Шанс". Телеигра.
18.45 "Пляж".
19.25 "Поздравления".
20.58 Прогноз погоды.
21.00 Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.30 "Шанс". Телеигра.
21.45 "Атака 50-футовой женщины". Худ. фильм.
23.10 Спортивная программа.

•• Пятница, 4 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.30 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс итальянского языка.
10.05 "Холода в начале весны". "И еще один радостный день". Короткометражные худ. фильмы.
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 Сделано в Беларуси. Закрытое акционерное общество "Белавтогаз".
12.10 "Сказки Гофмана". Фильм-балет.
13.15 Л.Ахеджакова в мелодраме "Мама Ануш".
14.30 "Сфера".
15.12 "Все любят цирк".
15.40 Судьба моя и надежда.
16.05 Регион. Передача из Витебска.
16.30 "Риск-версия". Телеигра.
17.15 "А музыка звучит..."
17.35 Наш край. Из истории г.п.Лельчицы Гомельской области.
18.00 Документальный экран. "Пауза".
18.40 Спортивные новости.
19.20 "Сегодня с вами..."
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.30 Видеозарисовка.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Виват, маэстро!" Новогоднее телешоу. Часть 1-я.
23.25 Криминальная хроника.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 "Каламбур".
9.45 Процесс.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 Худ. фильм "Приключения на берегах Онтарио".
15.50 "Ералаш".
16.00 "Нежный яд".
17.25 Джентльмен-шоу.
18.00 Экстренный вызов. Спасатели.
18.30 Вкусные истории.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Лейтенант Коломбо в детективе "Восток — дело тонкое".
22.10 "Эх, Семеновна!"
23.05 Клинт Иствуд и Чарли Шин в полицейском боевике "Напарник".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
7.35 Тысяча и один день.
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Лето нашей тайны".
10.55 Мультфильмы.
15.25 Диалоги о рыбалке.
16.20 Акуна матата.
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Агата Кристи. Пуаро". "Двадцать четыре черных дрозда". Телесериал.
19.25 "Городок".
20.45 Криминальная драма "Воры в законе".
22.30 "Панорама недели".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Агент национальной безопасности". "Доктор Фауст".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Без рецепта.
10.00 Дог-шоу "Я и моя собака".
10.30 Служба спасения.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Короли и капуста".
13.30 Сергей Юрский и Марина Неелова в приключенческом фильме "Сломанная подкова".
15.35 Сериал "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
20.35 Профессия — репортер. Ольга Надточей. "Требуются женщины..."
21.45 "Криминальная Россия". "Сибирский потрошитель". 1-я серия.
22.15 Вуди Харрельсон в комедии "Заводила — король кегельбана".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Насреддин в Бухаре". Худ. фильм.
13.00 "Мой Эрмитаж".
13.45 Мультфильмы.
14.30 "Бременские музыканты".
15.00 Новости.
15.10 "Жил - был [illegible]".
15.35 Времена и воины. "Спартанцы".
16.05 [illegible] "На чужбине". Фильм 2-й.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.30 "Откровенно..."
14.50 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение".Телесериал.
8.50 "Как они это построили".Док.сериал.
9.15 "Дом там,где сердце".Мелодрама.
16.30 "Из жизни женщин".
17.00 "Шехерезада".Телесериал.
17.50 Мультфильмы.
18.20 "Праздник в Вашем доме".
19.20 Телемагазин.
19.30 Пунктир.
20.10 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Послание". Фантастика.
22.20 Астро-дайджест.
22.30 Рейтинг-фильм.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.10—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.40 "Пляж".
19.23, 20.58 Прогноз погоды.
19.25 "Поздравления".
21.00 "В гостях у бабки Агапки".
21.15 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.40 Комедия "Без вины виноватый".
22.00 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 5 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Отражение". Док.фильм.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00, 19.00 Новости.
9.10 Мультфильмы.
9.45 Родовод. Традиционная культура белорусов. Деревня Баранцы Жабинковского района.
10.15 "Сегодня с вами..."
10.40 Здоровье.
11.05 Вершина мира.
11.30 Компьютерный полигон.
11.55 "Все нормально, мама!"
12.30 Спортивные новости.
12.50 Око.
13.15 В.Меликова и Р.Янковский в экранизации по рассказам А.П.Чехова "Володя большой, Володя маленький".
14.20 Олимп.
15.15 Познай себя. "Человек III тысячелетия".
15.35 "Поем с оркестром".
16.15 Бон тон.
16.45 Ток-шоу "Это моя работа". Эпидемиолог.
17.15 Земляки. Производственное объединение "Гранит". Передача 2-я.
18.15 "И смех, и беда". Короткометражный худ.фильм.
19.15 Из достоверных источников.
19.35 Бездельник.
20.00 Телебарометр. Прогноз погоды.
20.15 "Кофе с ароматом женщины".
21.00 Панорама.
21.40 "Роза ветров". Новогоднее телешоу. Часть 2-я.
22.55 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00, 9.00, 14.00, 17.00 Новости.
7.10 Слово пастыря.
7.25 "Все путешествия команды Кусто".
8.15 "Ералаш".
8.30 Играй, гармонь любимая!
9.10 Смак.
9.30 Поле чудес.
10.30 Утренняя почта.
11.00 Борис Андреев и Николай Крючков в музыкальной комедии "Трактористы".
12.50 В мире животных.
13.30 История одного шедевра.
14.10 Приключенческий сериал "Горец".
15.05 Мультазбука.
15.40 "В поисках утраченного". Евгения Ханаева.
16.20 Программа "Детектив-шоу".
17.10 "Ералаш".
17.30 Угадайка.
18.10 Худ. фильм "Полицейские и воры".
20.00 Авторская программа С. Доренко.
21.20 "Китайский городовой".
22.10 "Тысячелетие".
23.05 Боевик "Пуля в голову".

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильмы.
7.30 Папа, мама, я — спортивная семья.
8.30 Почта РТР.
9.00 Доброе утро, страна.
9.35 "Сто к одному".
10.25 Сам себе режиссер.
10.55 "Друзья". Худ. фильм.
11.25 Эх, дороги...
11.40 "Золотой ключ".
12.00, 20.00 Вести.
12.20 Федерация.
13.00 Б. Андреев, Л. Соколова, В. Никулин и Г. Вицин в фильме "Путь к причалу".
14.35 "Том и Джерри". Мультсериал .
15.05 Телеспецназ.
16.05 "На здоровье!" Ток-шоу.
17.00 Моя семья.
18.00 "Два рояля".
18.55 "Аншлаг" и К°.
20.45 Брюс Уиллис и Джейн Марч в триллере "Цвет ночи".
23.05 А.Лазарев-младший в премьере фильма "Тело капитана будет предано земле, а старший мичман будет петь".

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
7.15 "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
8.00 "Закон джунглей".
8.30 "Миго-инопланетянин".
9.15 "Чистосердечное признание".
9.45 Телеигра "О, счастливчик!"
10.25 Без рецепта.
11.25 Большие деньги.
11.55 М. Пуговкин, В. Высоцкий и Л. Лужина в комедии "Штрафной удар".
13.30 "В нашу гавань заходили корабли".
14.25 "Круглая дата". Полад Бюль-Бюль оглы.
15.25 "Любовные истории, которые потрясли мир". Франклин и Элеонора Рузвельт.
15.55 "Она написала убийство".
16.50 Дог-шоу "Я и моя собака".
17.25 Герой дня без галстука.
18.30 Шон Коннери в боевике "Джеймс Бонд — агент 007". "Операция "Шаровая молния".
21.45 "Ее звали Никита".
23.25 Ток-шоу "Про это".
0.05 Брюс Эббот в фильме "Реаниматор".

"КУЛЬТУРА"

9.05 "Читая Библию".
9.15 "Аистенок".
9.40 "Сорванец". Худ. фильм.
11.05 "Чебурашка". Мультфильм.
11.25 "Гражданская война в Америке". Документальный сериал . Фильм 6-й.
12.35 Графоман.
13.00 Рассказы старого сплетника. "Неизвестная роль... Евгения Евстигнеева".
13.30 Новости культуры.
13.45 "Сыновья и любовники". 7-я серия, заключительная.
14.40 "Мой цирк". Ведущий М. Никулин.

"МОГИЛЕВ-1"

15.00 "Руки вверх!" Фильм — детям.
16.10 "Праздник в Вашем доме".
17.25 "Новые приключения ментов". Телесериал.
18.15 "Праздник в Вашем доме".
19.30 Телемагазин.
19.40 "Четыре мушкетера". Комедия.
21.30 Телепоцман.
21.50 Астро-дайджест.
22.00 "Голубой тигр". Драма.
23.25 Диск-канал.
23.55 "Улица любви". Телесериал.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
8.00 Мультфильмы.
8.40—16.45 ТВ-6.
16.45 Мультфильм.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Комедия "Четыре мушкетера".
21.30 Высокая мода.
21.40 "Практическая магия". Худ. фильм.
23.25 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 6 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Приключение в королевстве".
8.26 Телебарометр.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 Мультиклуб.
9.25 "Вас вызывает Спортландия".
10.15 Турообъектив.
10.40 "Все нормально, мама!"
11.10 Арсенал.
11.35 Марсово поле.
11.50 АРТ-клуб. К 20-летию премьеры спектакля "Эдит Пиаф" в Республиканском Театре юного зрителя.
12.25 Спортивные новости.
12.45 Сделано в Беларуси. ПО "Минскоблнефтепродукт".
13.05 Телевизионный Дом кино. Лучшие актеры 1999 года.
13.45 Личности XX века. Док.сериал "Сокровенные люди".
14.00 Сельчане.
14.25 "Золотые ключи".
15.15 "На волне взаимопонимания".
16.00 Мультфильмы.
16.25 Худ.фильм "Неоконченная пьеса для механического пианино".
18.05 "Зорная ростань".
18.35 Теленавигатор.
19.00 "Кофе с ароматом женщины".
19.45 Премьера песни.
20.00 Резонанс.
20.45 Стадион.
21.05 Ток-шоу "Карамболь" с участием Виталия Вульфа.
21.40 Р.Янковский в худ. фильме "Грех лицедейства".
0.05 Авто-парк.
0.15 Акколада.

ОРТ

7.00, 9.00, 14.00 Новости.
7.10 Армейский магазин.
7.40 "Дисней-клуб": "Гуфи и его команда".
8.10 Утренняя звезда.
9.10 "Непутевые заметки".
9.30 Пока все дома.
10.00 Семейная комедия "Альф".
10.30 Здоровье.
11.00 "Знатоки" возвращаются. Дело N 6. "Шантаж". 1-я и 2-я серии.
14.10 Приключенческий сериал "Горец".
14.55 Умницы и умники.
15.25 "Дисней-клуб": "101 далматинец".
15.50 "Новые приключения Винни-Пуха".
16.15 Как это было. Расстрел парламента Армении. 1999 год.
16.55 Алла Шлак в программе "Женские истории".
17.25 Смехопанорама.
18.00 "Невзоров". Телевизионная программа.
18.55 Патрик Суэйзи, Деми Мур и Вупи Голдберг в фильме "Привидение".
21.10 Информационная программа с П.Шереметом.
22.10 Роберт Де Ниро в фильме "Бешеный бык".

"РОССИЯ"

7.00 Служу Отечеству.
7.30 Мультфильмы.
8.20 "Устами младенца". Телеигра.
8.50 Доброе утро, страна.
9.30 "Аншлаг" и К°.
10.30 "Ретро-городок".
11.00 Русское лото.
11.40 Премьера мультфильмов "Сказка о царевиче и трех лекарях", "Петушок и солнышко".
12.00 Вести.
12.20 Парламентский час.
13.00 Старая квартира. 90-е годы.
14.05 Диалоги о животных.
15.05 "Закон и порядок". Телесериал.
16.05 "Привести в исполнение". Док. фильм.
17.00 Перед "Зеркалом".
17.15 А.Калягин и Л.Гурченко в сатирической комедии "Прохиндиада-2".
19.00 Зеркало.
20.00 Бен Кросс, Анук Эме, Макс фон Сюдов и Дэвид Суше в фильме "Соломон". 1-я серия.
21.40 А. Малинин на "Площади звезд".
23.20 Гэри Олдман, Тим Рот и Ричард Дрейфус в фильме "Розенкранц и Гильденстерн мертвы".

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
7.15 "Ее звали Никита".
8.00 "Закон джунглей".
8.30 "Миго-инопланетянин".
9.15 Служба спасения.
9.40 Пойми меня.
10.10 Путешествия натуралиста.
10.40 Профессия — репортер. Ольга Надточей. "Требуются женщины..."
11.25 "Полундра".
11.55 "Женский взгляд".
12.25 Телеигра "Ключи от форта Баярд".
14.15 "Криминальная Россия". "Сибирский потрошитель". 1-я серия.
14.45 Фитиль.
15.35 Большие родители.
16.05 Документальный сериал "Холодная война".
16.55 "Она написала убийство".
18.00 Итоги.
19.35 Куклы.
19.50 "Улицы разбитых фонарей - II". "Визит к доктору".
20.50 "Итого".
21.10 Стив Гуттенберг и Шэрон Стоун в комедии "Полицейская академия".
22.50 "Третий тайм".

"КУЛЬТУРА"

9.05 "Читая Библию".
9.15 "Аистенок".
9.40 "Подмененная королева". Худ. фильм.
10.45 "Разыгрываем карагод".
11.40 "Консилиум".
12.05 Экспедиция "Чиж".
12.35 А.П.Чехов. "О любви". Читает Р. Плятт.
13.00 Полонезы Г. Венявского исполняет М. Федотов (скрипка).
13.15 Дворцовые тайны.
13.30 Новости культуры.
13.45 "Маугли". Мультфильм.
14.55 Кинопанорама. Встречи.

"МОГИЛЕВ-1"

15.00 "Планета сердится.Наводнение". Док. сериал.
15.55 "Приключения Папируса".Мультсериал.
16.20 "Циркачонок".Фильм — детям.
17.25 "Блеф-клуб".
18.00 "Новые приключения ментов".Телесериал.
18.50 Мультфильмы.
19.10 Телемагазин.
19.20 "Гуляют, болтают".Комедия.
20.45 Астро-дайджест.
20.55 "Паранойя".Триллер.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
8.00 Мультфильмы.
8.30—16.40 ТВ-6.
16.40 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 "Поздравления".
19.30 "Маппетс-шоу".
19.55 "Белый попугай".
20.20 Мультфильмы.
20.40 Док. фильм.
21.05 Высокая мода.
21.15 "Затерянный мир". Худ. фильм.
22.45 Спортивная программа.

Вуціны статак

Васіль БЫКАЎ

Невялічкі вуціны статак рыхтаваўся ў вырай.

На азёрах ужо ўсталявалася восень, стала сьцюдзёным паветра, дзьмулі напорыстыя паўночныя вятры. Колькі дзён запар зь няласкавага хмарнага неба чуліся разьвітальныя крыкі жураваў – тыя ўжо ляцелі туды, дзе грэла сонца, была цеплыня і шмат корму. Вуціны статак яшчэ там ня быў; вутачкі вывеліся апошняй вясной у тутэйшым возеры, за лета падрасьлі сярод трысьнягу ды асакі і дбалі толькі пра адно – як наесьціся. Сёлета з кормам стала кепска, ад няспынных дажджоў вада ў азёрах стаяла высокая, падтапіла берагі сенажацяў; буза, якую заўжды падабалі вуткі, апынулася глыбока пад вадой, даставаць зь яе корм было нязручна і цяжка. Ды й корму там чамусь усё менела, бо здатныя мясьціны пазамывала пяском з раскапаных экскаватарамі берагоў. Вуткі да восені пачуваліся слабымі, кепска расьлі і заўсёды былі галодныя.

Стары вуцяк ужо колькі дзён адчуваў пэўны трывожлівы неспакой – трэ было ляцець. Вадзяное птаства падпарадкоўвалася інстынкту, спрадвечнай птушынай волі, якая пэўнаю восеньскаю парой гнала птушак на поўдзень, дзе быў паратунак ад голаду й сьцюжы. Але гэты малады статак ня ведаў таго і, мусіць, мала што адчуваў. Змучаныя летнім недаяданьнем вуткі не пераставалі куляцца ў вадзе куцымі задкамі і шныпарыць па дне нястомнымі дзюбамі.

Неяк ураньні, як трохі пасьвятлела неба, нізка над хмарамі, лапочучы крыльлем, праляцеў вуціны шнурок, – гэта выпраўляўся ў вырай суседні статак з бліжняй затокі. Адчуўшы чарговы прыступ неспакою, вуцяк трохі прыўзьняўся ў вадзе і трывожліва заляскатаў крыльлем, даючы тым знак увагі свайму невялічкаму статку. Але ніводнай зь ягоных вуцятаў не было побач. Тады ён хуценька паплыў уздоўж трысьнягу гэтага даўжэзнага, на колькі вёрстаў возера і хутка ўбачыў усіх. Ягоныя вуткі зь нейкай неранейшай жвавасьцю куляліся ў мутнай вадзе, і вуцяк зразумеў: яны патрапілі на спажыву.

Тутэйшы бераг быў голы, без травы і кустоў. Наводдаль за гарбатым пагоркам высіліся два закапцелыя коміны, у неба зь якіх няспынна плыў дым. Увогуле тут было зацішна, пагорак затуляў невялічкую затоку ад сьцюдзёнага паўночнага ветру. Але неверагодна, каб тут выдалася кормнае месца, ды, мусіць, так. Інакш бы вуткі не мітусіліся з такой жвавасьцю, нібы ў апошні раз прагнучы наесьціся. Вуцяк таксама нырнуў паблізу, звыкла працерабіў дзюбкай па мяккім дне і адразу адчуў і сьцяміў, адкуль корм. У вадзе, схаваны пад крутым берагам, тырчэў канец бэтоннай трубы, зь якой штось плыло ў возера – мутнае, але прыемнае на смак.

У той дзень вуткі добра напіхалі свае тугія вальлі, пад вечар ледзьве варушыліся на вадзе і заначавалі купкай у недалёкім рэдзенькім трысьнягу. Вуцяк, які таксама з поўным вальлём прыплыў туды апошні, стомлена задрамаў, закалыханы на дробных хвалях, маючы пэўны намер заўтра ляцець.

Але назаўтра, як толькі ў небе над возерам стала віднець, вуціны статак навыперадкі памкнуў з трысьнягу ў затоку. Вутачкі адразу пачалі апантана куляцца, ныраць – сілкавацца. Мусіць, перад адлётам нягожа было надта набіваць свае вальлі, але вуцяк ня мог перапыніць іхную прагнасьць. Ды і сам ахвотна падсілкоўваўся разам, думаючы: хай наядуцца, а ўжо затым ён іх падыме ў палёт. Мусіць, такой жа думкі была і старая вуціха-маці, якая напачатку падплыла да вуцяка, коратка крэкнула і адразу падалася да статку. Яна і падрослых вутачак не пакідала без нагляду, хоць порсткія дочкі ўжо ня надта і слухалі яе. Ня тое што некалі малыя...

Гэтаксама ва ўвішнай мітусьні прамінуў і другі дзень. Вуткі ўволю наеліся, і ледзьве прыплылі ўвечары ў зацішны трысьнёг. За імі плыў вуцяк, і ўвесь невялічкі статак супакоена зазыбаўся на ціхай вадзе.



Назаўтра ранкам вуцяк выплыў з трысьнягу першым і гучным ляскатам крылаў падаў знак сабрацца да яго бліжэй. Вуціны статак адразу ажывеў, абудзіўся, але да вуцяка падплылі толькі тры вутачкі, астатнія порстка пашыбавалі пад кормны абрыў. То ўжо было непаслушэнства, вуцяк гатовы быў моцна абурыцца. Але ня ўмеў як – вуціная мова была памяркоўная і скупая. Свой новы сыгнал крыламі ён адрасаваў да вуціхі, якая была таксама скіравала за вуткамі. Тая змушаная была вярнуцца, нешта пракрэкала, што на вуцінай мове магло значыць: дай вуткам паесьці! Вуцяк даў папасьвіцца, але да паўдня, ня болей. У паўдзён ён там жа, пад абрывам, крыламі і гукам даў зразумець статку, што трэба канчаць сілкавацца, пара ў вырай. Яны на возеры апынуліся ці не апошнія. Як бы не спазьніліся.

Яго, аднак, кепска слухаліся, некаторыя ўсё спрабавалі ныраць, нібы баючыся страціць апошнія, здатныя да таго хвіліны. І вуцяк сьцяміў, што марныя яго захады, тым болей што і вуціха неўзабаве далучылася да неслухаў. Адна толькі меншанькая вутачка Шарэчка гайдалася каля вуцяка-бацькі, здаецца, маўкліва падзяляючы ягоны клопат.

Вуткі яўна ня мелі ахвоты нікуды ляцець, ім няблага стала і тут.

Вуцяк ня ведаў, што зь імі рабіць, як растлумачыць, што то – небясьпечна. Калі яны спозьняцца, у паднябесьсі іх можа захапіць непагадзь, а то й сьнег, яны загінуць, не даляцеўшы да цёплага выраю. А то яшчэ ўдараць маразы, і возера замерзьне. Тады яны застануцца бяз корму і прападуць таксама. Свой клопат ён з абурэньнем, гучна крэкаючы і хлопаючы па вадзе крыльлем, давёў статку, як той урэшце наеўся, і вуткі перасталі ныраць. Ды яму ня надта паверылі. Сапраўды, дагэтуль жа было не сьцюдзёна, даволі зацішна ў гэтай прыхаванай за пагоркам затоцы. А галоўнае – награтая за лета вазёрная вада здавалася цяплейшаю за паветра, зь яе не хацелася вылазіць. Ды вуцяк ведаў, што так будзе нядоўга, што возера ўрэшце замерзьне. А лёд – пагібель для вуцінага племя. Ды на ўсе ягоныя захады вуткі не адгукаліся, ня верачы яму. Вуціха-маці коратка і выразна павяла крылом – у адзін бок, затым у другі, што значыла: можа, замерзьне, а можа, і не. Затое тут корм.

Так, тут быў корм, які ўжо праклінаў вуцяк, бо той корм зьявіўся дужа не ўпару, – ня там і не тады, калі быў патрэбны. Цяпер тая нечаканая сытасьць пагражала згубіць вутак. Як і іхная згладнелая сквапнасьць. Вуткі за некалькі дзён прыкметна пацяжэлі і з заўжды туга набітым вальлём выглядалі няўклюдамі. З такім вальлём вельмі проста было нават не ўзьляцець у паветра, а ня толькі адолець даўгі і турботны шлях у цёплыя краі. Але што мог вуцяк?

Ён мог бы ляцець адзін або з Шарэчкай, якая пакуль што слухалася яго. Але ён не хацеў кінуць астатніх, гэтых пражэрлівых, скваплівых дурніц, якія не хацелі разумець, што іх чакае. Вуцяк так затрывожыўся, што сам перастаў ныраць у мутную ваду, адно кружыў у затоцы ды ляскаў па вадзе крыльлем, тым выказваючы свой клопат і гнеў. Ды, здаецца, на вуцяка ўжо перасталі зьвяртаць увагу.

Аднойчы ўранку ён згледзеў, як стравянелы пагорак зводдаль нібыта пакрыўся плесьняю – то браўся першы перадзімовы іней; у паветры надта марозіла. Але вада ў затоцы па-ранейшаму была цёплая, спрэс над ёю курэла лёгкая, празрыстая пара, у якой асабліва жвава пачуваліся вуткі. Вуцяк тады зрабіў ці не апошнюю спробу вывесьці іх на возера і ўзьняць на паветра. Але неўзабаве сьцяміў, што ніводная зь іх ужо не паднімецца – так усе ацяжэлі ад празьмернай сытасьці. І ўсё ня кідаюць ныраць – наядацца. Кожнага дня пад вечар туга набівалі абвіслыя вальлі. Корму ля трубы ня менела.

Вуцяк быў ужо не малады векам, аж тры восені запар лётаў у вырай і кожную вясну вяртаўся на сваё возера. І ён ня мог не разумець, чым скончыцца вуцінае непаслушэнства. Ён толькі ня ведаў, як сам павінны ставіцца да яго. Але і ратавацца самому таксама ўжо рабілася позна. Тады ён меў апошнюю размову з вуціхай-маці, якая адна магла яму паспрыяць. Ды не схацела. Мабыць, як заўжды, не хапіла яе вуцінага розуму.

Між тым на беразе лёг першы лёгкі зазімак. Пагорак забялеўся пад сьнегам, нават стаў прыгажэйшы, чым быў дагэтуль. А затока ўсё дымелася пад цёплай духмянай парай. У ёй надзвычай порстка і ўвішна пачуваліся вуткі. Аднойчы ўранку вуціха-маці так і сказала вуцяку: дарма турбуесься: тут будзе ня горш, чым у выраі. Тут – цывілізацыя, труба пракорміць. А мароз? – запярэчыў вуцяк. А марозу, можа, і ня будзе, адказала вутка. Не было ж яго ўлетку...

Вуцяк разумеў, што не памыляецца, але ня ўмеў як пераканаць яе ў тым. Асабліва, калі яе падтрымалі астатнія вуткі. Нават яго ўлюбёная Шарэчка і тая апошнім часам надта ацяжэла і болей трымалася на вадзе каля маці. Вуцяк усё болей заставаўся ў адзіноце і парой пачынаў сумнявацца ў сваёй праўдзе. А можа і насамрэч марозу ня будзе? Не бывае ж яго на поўдні, куды лятуць птушкі ў вырай.

Але то – на поўдні. Тут жа была калі й ня поўнач, дык нешта блізкае да яе. Чакаць чагось ладнага, мабыць, тут было марна. Ды вуткі, як і людзі, мелі патрэбу заўжды спадзявацца на лепшае. А што лепшае – падманная рэч, вуткі таго не разумелі.

Неяк уначы стала дужа сьцюдзёна, азяблыя вуткі ледзьве дачакаліся раньня. І тады ўбачылі, што бераг у трысьнягу ўзяўся прыгожым тонкім лядком. Некаторыя нават паспрабавалі яго дзюбкамі, на смак ён падабаўся і хутка таяў. Каб выплыць у затоку, яго лёгка праламвалі вальлямі і лапкамі і так дапляліся да кормнай трубы. Але назад статак ужо не паспеў – трысьнёг за дзень спрэс паўмярзаў у лёд. Вуціха-маці тады ўскараскалася на ледзяны закраек і валюхаста пашкандыбала пешшу. За ёй гэтаксама няўклюдна пабрылі вуткі, – ім карцела начаваць там, дзе прывыклі. Вуцяк туды не пайшоў і застаўся на вольнай вадзе ў затоцы.

Але і затока вузела. Мароз паволі і настойліва пашыраў на возеры свае ледзяныя абшары. Праз колькі дзён у затоцы застаўся невялічкі лапічак чыстай вады ўздоўж берагу. Там увесь дзень і сноўдалі вуткі. Праўда, ня ўсе. Іншыя вылязалі на лёд і паныла сядзелі, нібы чагось чакаючы. Сярод іх быў вуцяк. Ён ужо нікуды іх ня клікаў – не было куды клікаць. Ён толькі маўкліва дакараў сябе, што не намогся ў свой час змусіць іх падняцца ў вырай. Але як было адарваць згаладнелы статак ад багатага корму? Цяпер навошта корм?

Начавалі цяпер у цеснай палонцы, і неяк уранку згледзелі, што коміны, якія вытыркаліся ўдалечы з-за засьнежанага пагорку, перасталі дыміць. Тое вутак не спалохала. Спалохаліся яны, калі адчулі ў вадзе, што з бэтоннай трубы не цячэ нічога. Вуткі ня ведалі, што гэта збанкрутаваў завод, і труба перастала дзеяць. Як і ўсё астатняе на заводзе. А вузкая палонка тым часам усё вузела. Пакуль лёд аканчальна не самкнуўся зь берагамі.

... Як зноў настала вясна і стомленыя статкі гусей, жураўоў ды вутак пачалі вяртацца з далёкага выраю, яны ў азёрнай затоцы не знайшлі нікога.

Толькі рэшта мокрых стракатых пёрак дзе-нідзе гайдалася ў трысьнягу і ля берагу. То было ўсё, што засталося ад сытага бясьпечнага вуцінага статку.

Ад рэдакцыі. *Гэтае апавяданьне надрукавала пакуль адзіная газэта, зь якой у Васіля Быкава ўсталяваліся найбольш цёплыя чалавечыя і творчыя адносіны. Мы скарысталіся выданьнем, якое таксама любім, для перадрукоўкі гэтага апавяданьня. («НАША НІВА» №27 ад 18 кастрычніка 1999 г.)*

Калі ўсё зразумела – застаецца зьдзейсьніць!

У мінулыя выходныя дні сябры вядомай магілёўскай грамадзкай арганізацыі «Кола сяброў» абмяркоўвалі стратэгію сваіх дзеяньняў на бягучы год, дачыненьні з партнэрамі, грамадзтвам увогуле і з ўладай.

Руцінная мітусьня, адсутнасьць аб'яднаўчай волі і канкрэтовай мэты згубілі, як вядома, шмат якія добрыя намеры, высакародныя пачуцьці і сьветлыя пляны. Тым больш лёгка адбываецца гэта з грамадзкімі арганізацыямі, дзе часьцей за ўсё зьбіраюцца амбіцыёзныя (па-добраму) людзі й дзе няма таго, што ў дзяржаўных установах называецца распарадкам, службовымі абавязкамі і субардынацыяй. Магчымасьць самарэалізацыі на падставе разуменьня і прыйманьня кожным сябрам супольнасьці сваёй і агульнай мэтаў, еднасьць у стратэгіі дзеяньняў і тактыцы штодзённых клопатаў – вось што для іх надзейная перасьцярога супраць як нутраных распадных канфліктаў, так і неспрыяльнага вонкавага асяродзьдзя ў дзяржаве, якая, як нашая, ня церпіць ніякай канкурэнтнасьці.

Два дні не падаліся залішнімі для тэарэтычнага засваеньня праблемы, а тым больш для шчырых спрэчак, адкрытых выказваньняў і сьмелых прапановаў, якімі, на радасьць вядучаму сэмінара Ігару Шараму, вызначаліся літаральна ўсе ўдзельнікі «стратэгічнай гаворкі». Таму яна й дала плён.

Застаецца самае малое: ажыцьцявіць сфармуляваныя намеры.

Уласная інфармацыя

Па фэрмах ходзяць пракуроры

Магілёўскія пракуроры раптам даведаліся, што тое, як вядзецца ў нас сельская гаспадарка ці ня ёсьць злачынствам. Праўда, усе звычайныя людзі пра гэта ведалі заўжды, а вось пракуроры – толькі пасьля загаду, калі пачалі правяраць калгасы і саўгасы.

У прыватнасьці, мсьціслаўскія гаспадаркі правяраліся на прадмет парушэньняў заканадаўства ў жывёлагадоўлі. Гэта значыць, цікавіліся тым, як скаціна зімуе, як яе кормяць, як сочаць за яе здароўем. І высьветлілася, што, напрыклад, на фэрме ў вёсцы Сялец пракуроры ўбачылі, як даільны апарат ляжыць побач з навозам. Да таго – сырыя памяшканьні, холад, бруд, зламаныя сыстэмы каналізацыі і вадаправоды – вось што такое сёньня большасьць нашых фэрмаў. І таму нізкія надоі і дрэнная якасьць мяса. У саўгасе імя Тэльмана 120 каровак стаяла пад дахам, які трымаўся на чэсным слове старшыні. У калгасе «Октябрь» замест скаціны ў цёплым кароўніку стаяў... трактар, у другой фэрме ў цяпле ратаваліся ад халадоў шчанюкі, а цяляты мерзлі пры незашкляненых вокнах.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН, карэспандэнт «ТМ»

КАМАНДЗІРОВАЧНЫЯ СПРАВАЗДАЧЫ: ПОЛЬШЧА

А здаецца, нядаўна казалі: тое не замежжа

(Заканчэньне).

...Звычайная вёска на памежжы сучаснага магілёўскага й шклоўскага раёнаў. Пачатак 80-х. На прызьбе вясковае хаты сядзяць малое ды старое. На тварах двох адбіткі ўзрушанасьці. Заплаканыя вочы малога з абурэньнем касавурацца на старую, якая ў сваю чаргу з выглядам паблажлівасьці лашчыць мальца па галаве. Адстаўленая міска зь мёдам дый кінутая далоў недаетая скібка булкі сьведчаць аб крыўдзе малога на старую.

Мальцу падабалася гасьцяваць у цёткі Сахвеі, частавацца у яе мёд з малаком ды заўжды сьвежай булкай. Цётка Сахвея, сястра роднае бабы, прымала малога з радасьцю. Зварот «цётка» перадаўся ад пляменьнікаў да іхных дзяцей, сваіх дзетак Бог ня даў Сахвеі. Цётка дык цётка, пагадзілася Сахвея на мянушку.

Гэтым разам усё было звычайна. Мёд, малако, булка. Звыклае мейсца за сталом. Завіханьне гаспадыні ля печы. Звыклае цётчына «Божухна». Хлопец раптам спытаў: «А ці ёсьць Бог?». «Есьцека, а як жа ж», – адказала Сахвея, ня гледзячы на малога. «Няма, у школцы кажуць, няма», – захваляваўся цікаўны ўнук. «Дык гэта ў школцы, – ужо з дакорам адказала цётка. – Вунь, дзядзька Іван і той кажа, што ёсьць». «Не люблю дзядзькі Івана, у школе кажуць няма», – малое не магло пагадзіцца, што ў школе хлусяць. Цётка Сахвея ж у сваю чаргу не магла зьняпраўдзіць сваю пажыцьцёвую набажнасьць.

Мінуў час. Дваццаць год як адзін дзень. Сьвет зазнаў вялікія перамены, дзякуючы якім я, мажліва, і патрапіў у Польшчу.

НАБАЖНАСЬЦЬ ПАЛЯКА

Томаш Патэр, дырэктар газэты «KURIER Wejherowski», каляжанка са Слуцаку Крысьця й я вандруем па Вейхэроўскай Кальварыі. Польская набажнасьць. Што гэта – міт, лад жыцьця або жыцьцёвая самачыннасьць? «Томак, – перамогшы сваю прыродную сьціпласьць, зьвяртаюся да пана дырэктара, – што для Паляка Касьцёл?» Счакаўшы, мабыць, падумаўшы, пан Томак адказаў: «138 год край Кашубскі знаходзіўся пад акупацыяй Прусаў, лічы Немцаў. Каб засьцерагчыся ад асіміляцыі, Палякі йшлі ў Касьцёл, размаўлялі ў ім з Богам па-польску. Гэтая гамана натхняла, дапамагала жыць, пазбаўляла душы роспачы. Касьцёл – гэта ратавальнік, збаўца. Касьцёл – гэта Сьвятло». Ёсьць над чым падумаць. Менавіта ў гэты момант я і ўзгадаў той выпадак зь дзяцінства. Дзіцячая наіўнасьць, вера ў праўдзівасьць дасьведчанага дарослага, які дакляруе, а ў душы наўрацьці верыць у гэтыя дэклараваньні. Менавіта ў дзяцінстве пазнаеш двумернасьць ды двуаблічча дарослага. Двумернасьць нашага існаваньня, заведамая хлусьня, у выніку бязьвер'е.

У Гданьску ў касьцёле «MARIACKI» найперш што уразіла дык гэта падлога. Вымашчаная пліткай, шліфаваная. Колькі ног вітала падлога за свае 700 год. Увогуле мае паводзіны ў касьцёле, якіх я наведаў нямала, былі дзіўна двухаблічныя. Найперш – гэта сваім наведваньнем, сваім аблудам не абразіць годнасьць вернікаў. Так, калена схіляю, але не хрышчуся. Паводзіны малпы, засьпеў аднойчы сябе на думцы. Апраўданьне ў выхаваньні.

Ян Павал Другі. Ён прыйшоў, калі яго чакалі. Чакалі са спадзевам, з надзеяй у лепшы лёс. Сьвяты Айцец стаўся сьветачам у барацьбе за волю Адроджанае Польшчы. Прысутнасьць Папы Рымскага адчуваецца ўва ўсім. Справа нават не ў плякатах з выявай Яна Паўла Другога, якіх процьма. Сама энэргэтыка прысутнасьці Сьвятара вітае ў паветры. Наведваньне Пантыфікам Польшчы сталася гістарычнай падзеяй, якая засьведчыла незваротнасьць працэсаў, якія адбываліся й адбываюцца ў краіне. У ягонае краіне. «Як ключы ад Нябеснае Брамы, Выраю ў рукох сьвятога Пятра, гэтак лёс нацыі ў рукох самой нацыі», – кажа сьвяты Айцец сваім суродзічам.

Блукаючы па вулачкам Вейхэрова, я знайшоў для сябе яшчэ адно сьведчаньне польскае набажнасьці. Ці хутчэй у гэтым выпадку набажнасьць паўстае ў ролі вянца паміж мінулым і сучасным. Блаславёная Аліцыя Катоўска (Alicja Kotowska), сымбаль самахвярнасьці, аддансьці абранаму шляху – водгук мінулае вайны. Пакутніцкі твар жанчыны поўны мужнасьці й жаноцкасьці ўваднначасьсе. У вачох – нязломнасьць і пяшчота. Пранікнёнасьць позірку цьвердзіць прыродную набажнасьць кабеты. У 1939 годзе Вейхэрова было акупаванае Нямеччынай. Каб засьцерагчыся ад супраціву акупацыі, фашыстоўцы склалі сьпісы патэнцыйных ачольнікаў гэтага супраціву. Паводле гэтага сьпісу 108 асобаў былі вывезеныя за Вейхэрова й растраляныя. Сярод растраляных была і саракагадовая манашка Аліцыя Катоўска. Па знаходжаньню Яна Паўла Другога Аліцыя Катоўска была далучаная да ліку Сьвятых, астатнія 107 асобаў сталіся мучанікамі...



ЗАПРОСІНЫ

Шчасьлівы й доўгачаканы момант у жыцьці вучнёўскага люду – вакацыі. Ня ў меншай ступені чакаюць гэтага моманту й сейбіты сьветлага, чыстага, вечнага – настаўнікі. Думаю, я ня буду выглядаць задужа цынічным, калі параўную настаўнікаў з спружынаю, якая напрыканцы навучальнага году гатовая спружыніць сваёй нэрвовасьцю, раздражнёнасьцю, стомленасьцю. Напластаваньне праблемаў, невукі вучні й іхныя назойлівыя пытаньні, зьедлівыя кпіны, а яшчэ сямья. Як хочацца акунуцца ў атмасфэру разьнявоненасьці, неабцяжаранасьці прафэсыйнымі, грамадзкімі, сямейнымі клопатамі. І ўсё думаецца, думаецца, думаецца. І ўсё мары, мары, мары.

У Вейхэроўскіх настаўнікаў сталася традыцыяй урачыста сьвяткаваць першы дзень вакацыяў. Вядома ж, добрае сьвята добра каштуе. Часткова дапамагаюць складкі, але часткова. Асноўную бондаўку гэтага «добра каштуе» ахвяруюць сябры школаў, колішнія вучні. Яны ж забясьпечваюць настаўнікаў усім неабходным для адпачынку. Пачэсную справу арганізацыі й правядзеньня сьвяткаваньня мы мелі мажлівасьць убачыць на ўласныя вочы.

Вечаровы лес. Цяжкія хмары, у абдымках якіх месяц выглядае па сірочаму безабаронным. Росная атава. Зорка. Таямнічыя гукі лясьнога жыцьця. І туман, які павольна паглынае хутар песьніка. У спрадвечнай вечаровай цішы чуецца вясёлы гоман, які час ад часу перарываецца сьпевам. На невялікім падворку вартаўніка лесу пануе весялосьць. Зыркае цяпельца асьвятляе твары людзей, узбуджаных сьпевамі ды скокам.

«Сьвята Дзіка» дасягнула свайго апагею. Менавіта «Сьвятам Дзіка» распачынаюць будні вакацыяў вейхэроўскія настаўнікі. Чаму дзіка, Бог яго ведае. Вобраз упаляванага дзіка, магчыма, атаясамліваецца настаўнікамі зь перамогаю ведаў над невуцтвам.

Гаспадар хутару, на якім падзецца дзейства, палюе дзіка, ён жа гатуе стравы з упаляванай жывёліны. Тым часам сейбіты разумнага, чыстага, вечнага сьвяткуюць. Сьвяткуюць, варта падкрэсьліць, з размахам. Разгавеўшыся чаркай гарэлкі, спружына спружыньвае весялосьцю, запалам, рухавасьцю. Цікава з боку назіраць, як дарослыя людзі, настаўнікі!, ператвараюцца ў гарэзьлівых дзяцей. На момант нам, гасьцям на гэтым сьвяце, падалося, што на нас пазабыліся. Не, не пазабыліся. Беларусам было прапанавана выканаць нешта беларускае па беларуску. Я ведаў, што валодаю цудоўным музычным голасам і гэткім жа слыхам. Сьведкам гэтага ёсьць маё дзіця: калі я пачынаю сьпяваць, дачка пачынае плакаць: дужа чульліва, мабыць, сьпяваю. Але, на жаль, з мноства песьняў, вядомых мне, я ведаю толькі іхны пачатак ды канец. Пра музычнае дараваньне сваёй каляжанкі са Слуцаку Крысьці я мог толькі здагадвацца. Узгаднiўшы пазыцыі, мы знайшлі паразуменьне. Выйсьцем са складанага становішча сталася «А я лягу прыляку». Слухачы былі агаломшаныя выкананьнем.



Нечаканы посьпех у намінацыі «Беларуская песьня» надаў сьмеласьці й натхніў на больш шчыльныя зносіны з настаўнікамі. Празь беларускую ветлівую ўпартасьць мы дамагліся запрашэньня наведаць майсцовую школу «OSEMKI». Тым больш у запросінах лёгка было ўгледзець шарм прынаднасьці. Сёлета школа адзначыла юбілей – 40 год.

Будынак школы ўражваў сваёй маштабнасьцю. З вышыні птушынага палёту, па словах дырэктара школы, пана Міраслава Сільдаткэ, збудаваньне нагадвае загалоўную літару «Т». І гэтыя словы былі вымаўленыя з ноткамі таямнічасьці, быццам бы ў гэтай літары схаванае нешта ягонае ўласнае... школьнае. Навокал зеляніна, дагледжанасьць. На даху тузін парабалічных антэнаў. Навучальны год скончыўся, але энэргэтыка прысутнасьці вучнёўскага люду яшчэ блукае па доўгіх калідорах навучальнае ўстановы. Кампутаровыя клясы, дзьве спартовыя залі, адна зь якіх адпавядае патрабаваньням міжнародных спаборніцтваў, тутака ж і рэкляма. Дарэчы, рэкляма ня ёсьць простым аздабленьнем сьценаў, зь яе школа дастае для сябе неабходныя грошы, напрыклад, для будаўніцтва свайго школьнага басэйну.

За часамі майго школьнага жыцьця кабінэт дырэктара атаясамліваўся зь нечым страшэнна небясьпечным. Мабыць, таму пры наведваньні кабінэту дырэктара польскай школы мяне ахапіла шчымлівае пачуцьцё хваляваньня. Дырэктар, убачыўшы мой зьніякавелы стан, з разуменьнем усьміхнуўся. Вялікае памяшканьне, на дзіва ўтульнае, сьцены нагадваюць «дошку гонару» савецкіх часоў, адрозьненьне хіба што адзінае – на фотаздымках ну ніяк не скамянелыя твары пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, на фотаздымках – дзеці. Пасярэдзіне вялікі кольцы стол. Для зьняцьця няхваляватасьці чарка гарэлкі – найлепшы сродак, потым другая й прыемная гаворка ні аб чым. Пытаюся пра антэны на даху школы. Яшчэ чарка гарэлкі й пад дырэктарава «рушым» ідзем шукаць адказ на маё пытаньне. Як высьветлілася, у сутарэньнях школы ёсьць тэлевізыйная студыя, якая аднначасова й школьная й меская. «А я зь Беласточчыны», – пачуўшы беларускую гаворку, кажа супрацоўніца студыі й дадае – «й разумею па-беларуску». У які ўжо раз драбяза кранае душу...

РАЗЬВІТАНЬНЕ

Бутэлька шампанскага, пляшка гарэлкі, дзьве пляшкі гарэлкі, таматны сок і нехта спухае, нехта кажа. Разьвітаньне. У гэты момант не пакідае пачуцьцё няскончанасьці, незавершанасьці. Ня ўсё пачулі, ня ўсё выказалі, не пра ўсё дазналіся. Пьемо за Вялікае Княства. Пьемо за Каралеўства Польскае. Пьемо за Рэч Паспалітую. Не прамінулі ўзгадаць жанчынаў, зазірнуцьу будучыню. Узьнялі келіх за Вейхэрова й Магілёў, Кракаў ды Вільню, Менск і Варшаву. Адгалоскі разьвітальных прамоваў балюча прыгадваюцца зранку. Ізноў цягнік, цяперыча дадому. Радасьць сустрэчы з Радзімай правакуе ўзгадаць Агінскага й ягоны незабыўны твор «Разьвітаньне з Радзімай». Бывай Вейхэрова, бывай, крыху цяпер вядомае мне Племя Кашубаў.

Алесь АСІПЦОЎ

Фота аўтара.
Ліпень 1999 г.

ДА 10-ГОДЗЬДЗЯ ЗАКОНУ АБ МОВАХ

Немагчыма ладзіць родны дом на няродных думках і мове

Падзея гэтая з нашай найноўшай гісторыі выдзяляецца ў шэрагу іншых таму, што закон, аб якім ідзе гаворка, фактычна стаў першым законам, скіраваным на нацыянальнае адраджэньне, і прыняты ён быў, як ня дзіўна, яшчэ камуністычным Вярхоўным Саветам. Але падзякаваць за гэта трэба Радзіму Гарэцкаму, Нілу Гілевічу, Адаму Мальдзісу, Алегу Трусаву, шмат яшчэ якім выдатным людзям.

Гэта быў пік гарбачоўскай перабудовы. Людзі, крыху аглушаныя рэхам развалу бэрлінскай сьцяны, уздымалі галовы і п'янелі ад водару свабоды, якім павеяла пасьля першых за савецкі перыяд дэмакратычных выбараў. Усё гэта выбівала са звыклай каляіны закасьнелыя партыйныя кадры, і тыя ня вельмі агрэсіўна супраціўляліся новым ініцыятывам.

Але невялікая беларуская група ў амаль поўнасьцю намэнклятурным Вярхоўным Савеце БССР разумела, што толькі сваімі сіламі гэты Закон не праштурхнуць, што тут трэба моцная зьнешняя падтрымка. Так зьявілася ідэя стварэньня масавай грамадзкай арганізацыі – Таварыства беларускай мовы.

На заклік Ніла Гілевіча ўжо крыху разбуджаная грамадзкасьць адгукнулася даволі актыўна. Летам 1989 года быў праведзены ўстаноўчы зьезд ТБМ і адразу пачалі стварацца рэгіянальныя структуры. Магілёўская гарадзкая арганізацыя ТБМ была створана адной зь першых у Беларусі, на яе ўстаноўчы сход сабралася поўная заля ДК швейнай фабрыкі.

26 студзеня 1990 года, калі быў прыняты Закон аб мовах, упершыню за апошнія тры стагодзьдзі (з таго часу, як Сойм Рэчы Паспалітай у 1696 годзе забараніў ужываньне беларускай мовы ў дзяржаўным справаводстве) ***беларуская мова была абвешчаная дзяржаўнай мовай краіны***.

Дзяржава (адпаведна гэтаму Закону) забясьпечвала як усебаковае разьвіцьцё і функцыянаваньне беларускай мовы ва ўсіх сфэрах грамадзкага жыцьця, так і права свабоднага карыстаньня рускай мовай, праяўляючы пры гэтым клопат аб свабодным разьвіцьці ўсіх нацыянальных моваў, якімі карыстаецца насельніцтва Беларусі.

Увод у дзеяньне Закона аб мовах прадугледжваўся паступовы – на працягу дзесяці гадоў. Гэта азначае, што зь сёньняшняга дня Закон павінен быў пачаць працаваць цалкам, усімі сваімі артыкуламі. Павінны былі стаць беларускімі дзяржаўнае і юрыдычнае справаводзтва, адукацыя і выхаваньне, навука, тапаніміка і службы інфармацыі. Пры гэтым гарантавалася па ўзгадненьні бакоў выкарыстаньне рускай мовы (напрыклад, пры адказах на звароты ў дзяржаўныя ўстановы ці пры выбары мовы адукацыі для сваіх дзяцей) і нават іншых прыймальных для бакоў моваў.

Хутчэй за ўсё, большасьць з тых, хто галасаваў за прыняцьце Закона, ня вельмі верылі ў яго ажыцьцяўленьне. І выканаўчыя ўлады няветліва сустрэлі новы Закон. Тым ня менш, пераадольваючы супраціўленьне, ён пачаў працаваць. Зьяўляліся беларускія клясы ў школах, беларускія групы ў дзіцячых садках, ствараліся новыя беларускамоўныя падручнікі, слоўнікі, праводзіліся навуковыя тэрміналягічныя канфэрэнцыі, былі захады да прывядзеньня правапісу ў адпаведнасьць з натуральнымі для нашай мовы ўласьцівасьцямі (па Тарашкевічу), распрацоўваліся беларускамоўныя бланкі дакумэнтаў, паштоўкі, мяняліся вулічныя шыльды...

У Магілёве адкрыліся дзьве беларускія гімназіі, пачаў працаваць нядзельны беларускі ліцэй, меркавалася, што праз пэўны час ён ператворыцца ў нармальны звычайны ліцэй з цалкам беларускім духам.

Але гэтым намерам не было суджана ажыцьцявіцца. Спыніў (дакладней, замарудзіў, бо спыніць ужо немагчыма) працэс беларускага адраджэньня адзін чалавек, які паабяцаў насельніцтву вярнуць Савецкі Саюз і якога за гэта абралі прэзыдэнтам... Беларусі.

Выразна папярэдняе сьцьвярджэньне характарызуюць наступныя лічбы: у 1993 годзе ў беларускамоўныя першыя клясы школ Магілёва прынята 1063 вучні, у 1994 годзе (адразу пасьля абраньня прэзыдэнта) – 280 вучняў, у 1995 годзе – 12 вучняў. А пра тое, як тут улічваліся «пажаданьні» бацькоў, пра шмат якія іншыя акалічнасьці вырашэньня праблемы «роўнасьці» моваў, «ТМ» распавядаў на сваіх старонках неаднойчы.

Калі сёньня прааналізаваць Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь, нават з тымі дапаўненьнямі і папраўкамі, якія ўнесеныя туды за час прэзыдэнцкага кіраваньня і якія відавочна аддалілі беларускае адраджэньне, то няцяжка пераканацца, што гэты Закон больш чым на палову сваіх артыкулаў не выконваецца. І праваахоўчыя органы імкнуцца гэтага не заўважаць, а калі ім нехта нагадвае, робяць абыякавы ці паблажлівы выгляд – маўляў, ёсьць больш важныя справы.

Закон цяпер нібыта сядзіць у засадзе. Але ягоны Час прыдзе ізноў. Інакш якія мы беларусы...

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшыня абласной арганізацыі ТБМ



КАТАЛЁГ

аўдыё-відэа касэтаў, кампакт-дыскаў беларускіх музыкаў

АЎДЫЁКАСЭТЫ СОЛЬНЫЯ АЛЬБОМЫ

УЛІС «Чужаніца»
УЛІС «Краіна доўгай белай хмары»
УЛІС «Танцы на даху»
УЛІС «Live 1996»
УЛІС «Блуканьне»
Крама «Хворы на рок-н-рол»
Крама «Гэй, там, налівай»
Крама «Лепшыя песьні»
Крама «Што дапаможа нам»
Крыві «Hei-Loli»
Крыві «За туманам»
Новае Неба «Дзеці чорнага гораду»
Новае Неба «Сон у трамваі»
Новае Неба «Go Home»
Новае Неба «Мая краіна»
NRM «Ла-ЛаЛаЛа»
NRM «Одзірыдзідзіна»
NRM «Акустычныя канцэрты канца 20 стагодзьдзя»(падвоены)
NRM «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.»
Народны Альбом супольны праект
Алмазный Фронт «Жизнь в городе без моря»
Атами «Язык стволов»
Tornado. «Apeman»
Stokes «No Escape»
Ravens «Mirror»

АРХІЎ

БОНДА «Лепшыя песьні»
Зіндан «Лепшыя песьні»
Мроя «Песьні з альбомаў 1988-90г.г.»
Мясцовы час «Наша Ўскраіна»

ЗБОРНЫЯ ПРАГРАМЫ

Залаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 1
Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты.
Залаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 2
Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы.
Залаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 3
Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько и Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Залаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 4
Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЗАПІСЫ

Беларускія народныя казкі
Г. Х. Андэрсэн. Стойкі алавянны салдацік (інсцэніроўка)
В. Гаўф. Каліф-бусел (інсцэніроўка)
Л. Пранчак. Цік-так ходзікі. (песьні, вершы, казкі).
В. Серых. Дзень-запацень

КАМПАКТ-ДЫСКІ

Бонда (падвоены)
Крама «Што дапаможа нам»
Крыві «Людзям»
Новае Неба «Выбранае»
Новае Неба «Cepeliny»
NRM Акустычныя канцэрты (падвоены)
NRM «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.»

ВІДЭАКАСЭТЫ

Беларускі Рок-н-рол. Тэлевэрсыі фэстываляў «Рок па вакацыях-96» і «Рок-каранацыя-96»
Рок-каранацыя-97
Рок-каранацыя-98
Folk назаўжды. Крыві. Сьвята. Сваякі. Палац.

КНІГІ

«Новы дамавікамэрон», «Кантамінацыі» Адама Глёбуса
Часопіс «ARCHE», №№ 1 – 4
«Сто вякоў беларускай гісторыі» Г. Сагановіча, У. Арлова
Вершы Л.Геніюш

Усё пералічанае ў каталёгу можна набыць альбо замовіць, патэлефанаваўшы 25-57-85, альбо 22-97-82, спытаць Алеся Асіпцова.

ПРОСТАЯ МОВА

«Вучэбна-метадычны збор па грамадзянскай абароне»

«Аднак сурьёзную заклапочанасьць выклікае стан сховішчаў. На сёньняшні дзень з 52 сховішчаў раёна адпавядаюць патрабаваньням толькі 25. Гэта абсалютна недапушчальна ў бягучых умовах, цалкам зразумела, што гэтыя аб'екты грамадзянскай абароны павінны ўтрымлівацца ва ўзорным стане».

З выступу старшыні Ленінскага райвыканкама С. Барадаўкі.

(Газэта «Бабруйскае жыцьцё» №8, 18.01.00 г.)

Да ўвагі васьмі- і дзевяціклясьнікаў



Магілёўскі абласны ліцэй пры МДзУ (унівэрсытэце) арганізуе бясплатныя падрыхтоўчыя курсы для навучэнцаў г. Магілёва і вобласьці па дысцыплінах:

для 8 кл. – матэматыка, фізыка, інфарматыка;

для 9 кл. – матэматыка, гісторыя.

Пачатак заняткаў у лютым. Арганізацыйны сход адбудзецца 1 лютага а 17-й гадзіне па адрасе: Магілёў, вул. Вароўскага, 29 (ехаць тралейбусамі 2 і 9 да прыпынку «Дняпроўскі мост»).

Даведкі па тэлефонах: **25-83-31, 25-81-13.**



Запрашальная візітоўка

Гэтыя мілыя жанчыны запрашаюць вас у новы магілёўскі музэй – этнаграфіі й народнага побыту. Якія экспанаты сабраныя тут, пра што цікавае можна даведацца й пачуць – пра гэта мы зробім рэпартаж. А каб параўнаць уражаньні, наведайце музэй самі, непасрэдна. Потым пагаворым... Вул. Першамайская, 10 (былая дзекабрысцкая прыбудова).

Рэдактар Генадзь СУДНІК



Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй «КОЛА СЯБРОЎ».

Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.

Штотыднёвік

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

Тэлефон: 31-04-15,
Тэл./факс: 22-97-82,
E-mail: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 3. Наклад 2000 асобнікаў.